**УДК 398.22**



***© Сяргей Даніленка***
*прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Магілёўскага інстытута МУС, кандыдат філалагічных навук, дацэнт (Беларусь)*

**© *Siarhiej Danilenka***
*Professor of the Social and Humanitarian Disciplines dept. of the Mogilev Institute of the Ministry of Internal Affairs, PhD in philology, Associate Professor (Belarus)*
*e-mail: danilenka.siarhei@gmail.com*

# АСГАРД: ГЕАГРАФІЧНАЯ ЛАКАЛІЗАЦЫЯ І ЭТНІЧНАЯ АТРЫБУЦЫЯ

*На аснове еўгемерычнага аналізу сярэднявечных міфаграфічных крыніц у кантэксце палеаландшафтнай сітуацыі ў Паўночным Прычарнамор'і сярэдзіны I тысячагоддзя да н.э. у артыкуле робіцца выснова пра рэальнасць кроскультурнага кантакту дзвюх розных этнапалітычных груп – сіндаў і іанійскіх грэкаў, вядомых у германа-скандынаўскай традыцыі як Асы і Ваны. Лакалізуецца такі кантакт на берагах Баспора Кімерыйскага і звязаны з працэсам іянійскай каланізацыі гэтага раёна і далейшым паўстаннем Баспорскага царства.*

*Сцвярджаецца, што роля міфа як дзейснага сродку асэнсавання гісторыі застаецца надзвычай недаацэненай да сённяшняга часу, і меркаванне пра прадуктыўнасць еўгемерычных падыходаў да інтэрпрэтацыі міфалагічных сюжэтаў традыцыйна адзначаецца калі не вучонай пагардай, то паблажлівым скепсісам большасці даследчыкаў. Між тым, міф, per se, у архаічным грамадстве з'яўляецца відавочным вынікам сакралізацыі гісторыі, бо адна з асноўных яго функцый – руплівая фіксацыя і трансляцыя аб'ектыўнай інфармацыі аб Пачатках пэўнай традыцыі, увасобленай перш за ўсё ў генеалагічных наратывах, роля якіх у мілітарных соцыумах з патрылінейнай сістэмай спадкаемства палітычнай улады з'яўляецца неацэнна важнай. Такая інфармацыя, натуральна, не пазбаўлена рознага роду эпічных аберацый, абумоўленых перш за ўсё жанравай спецыфікай мастацкіх форм маніфестацыі і бытавання падобнага роду сюжэтаў. Таму галоўнай задачай навуковай дэшыфроўкі міфа з'яўляецца карэктнае адмежаванне аб'ектыўнай гістарычнай фактуры ад рознага кшталту рытарычных фігур і іншых эмацыйна-вобразных канструкцый, прыналежных міфа-паэтычнаму ладу мыслення.*

Уласна еўгемерычны дыскурс генезы дадзенай групы персанажаў германа-скандынаўскага міфа звязаны перш за ўсё з імем Сноры Стурлусана (1178–1241), які занатаваў сюжэты пра паходжанне Асаў з Анаталійскага ўзбярэжжа Гелеспонта, а таксама з нізоўяў ракі Танаіс. Так, пачатак "рэальнай" гісторыі гэтага легендарнага соцыуму лакалізуецца ім у Прыямавай Троі, як

гэта вынікае з пралога да “*Snorra-Edda*”, дзе паўстае маляўнічы вобраз зямнога адпаведніка раю, якім аўтару бачыцца Малая Азія: “*Frá norðri ok um austrhálfur alt til suðrs — Þat er kallat Ásíá; í Þeim hluta veraldar er ǫll fegrð ok prýði ok eignir jarðar-ávaxtar, gull ok gimsteinar; Þar er ok mið verǫldin; ok svá sem Þar er jǫrðin fegri ok betri ǫllum kostum en* ***í ǫðrum*** *stǫðum, svá var ok mannfólkit Þar mest tígnat af ǫllum giptunum, spekinni ok aflinu, fegrðinni ok allz konar kunnostu*”[1]. Сакральным цэнтрам гэтай “зямлі запаветнай” выступае горад ***Троя*** (*Trója*), які быў “<…> ***нашмат большы за іншыя і пабудаваны з усім майстэрствам і раскошай, што былі тады даступныя***” (“*Þessi staðr var miklu meiri gǫrr en aðrir ok með meira hagleik á marga lund með kostandi ok fǫngum, er Þar váru til*”) [1, с. 3–4]. Траянскае царства пры гэтым малюецца Сноры Стурлусанам як канфедэрацыя шэрагу дробных палітычных утварэнняў: “*Nær miðri verǫldini var gǫrt Þat hús ok herbergi, er ágætast hefir verit, er kallat er Trója <…> Þar váru xii. konungdómar ok einn yfirkonungr, ok lágu mǫrg Þjóðlǫnd til hvers konungdómsins; Þar váru í borginni xii. hǫfðingjar; Þessir hǫfðingjar hafa verit um fram aðra menn, Þá er verit hafa í verǫldu, um alla manndómliga hluti*”[2]. Далей, узнаўляючы канфедэратыўны лад Траянскага царства, Сноры Стурлусан сярод дванаццаці траянскіх правадыроў — “***конунгаў***” — называе ***Мунана*** ці ***Менана***. Жанаты з дачкой цара Прыяма ***Траан***, ён нібыта нараджае сына імем ***Трор*** / ***Тор***, які, выхоўваючыся ў ***Фракіі***, у дванаццацігадовым узросце становіцца ўладаром гэтай краіны: “*Einn konungr, er Þar var, er nefndr Múnón eða Mennón; hann átti dóttur hǫfuðkonungsins Príámí; sú hét Tróán; Þau áttu son, hann hét Trór, er vér kǫllum Þór; hann var at upfæzlu í Trákíá með hertoga Þeim, er nefndr er Lóríkús <…> Þá er hann var xii. vetra, Þá hafði hann fult afl <…> ok Þá drap hann Lóríkúm hertoga, fóstra sinn, ok konu hans Lórá eða Glórá ok eignaði sér ríkit Trákiá <…>*”[3]. Панаванне ў Фракіі ўзурпатара Трора з нашчадкамі доўжылася аж да адыходу адтуль Одзіна з ***Асамі*** на пошукі “***славы***”, і гэты прамежак часу быў роўны цягу жыцця 18 пакаленняў, пералічаных Сноры Стурлусанам: *Trór* (*Þór*) — *Loriði* — *Einriði* — *Vingeþórr* — *Vingenir* — *Móða* — *Magi* — *Sescef* — *Beðvig* — *Athra* (*Annan*) — *Ítrmann* — *Heremóð* — *Scialdun* (***Skjǫld***) — *Biaf* (*Bjár*) — *Jat* —

---

[1] <З поўначы на ўсход і да самага поўдня цягнецца частка, званая Азіяй. У гэтай частцы свету ўсё прыгожа і раскошна, там уладанні зямных пладоў, золата і каштоўнае каменне. Там знаходзіцца сярэдзіна зямлі. З-за таго, што сама зямля ва ўсім прыгажэйшая і лепшая, людзі, што яе насяляюць, таксама вызначаюцца ўсімі талентамі: мудрасцю і сілай, прыгажосцю і разнастайнымі ведамі> (тут і далей пераклад першакрыніц наш. — *С. Д.*).

[2] <Блізу сярэдзіны зямлі быў пабудаваны горад, што набыў вялізную славу. Ён зваўся тады Троя <…> Было там дванаццаць дзяржаў, і быў адзін вярхоўны ўладар. У кожную дзяржаву ўваходзіла шмат прасторных земляў. У горадзе было дванаццаць уладароў. Гэтыя ўладары ўсімі прыналежнымі людзям якасцямі пераўзыходзілі іншых людзей, што калі-небудзь жылі на зямлі>.

[3] <Аднаго з конунгаў у Троі звалі Мунан ці Менан; ён быў жанаты з дачкой вярхоўнага конунга Прыяма, і яе звалі Траан; у іх быў сын па імені Трор, мы клічам яго Торам; ён выхоўвася ў Фракіі ў герцага па імені Лорыкус <…> у дванаццаць год ён быў ужо ў поўнай моцы <…> і ён забіў герцага Лорыкуса, свайго выхаваццеля, і жонку яго Лору, альбо Глору, і завалодаў іх дзяржавай Фракіяй <…>>.

*Guðólfr* — *Finn* — *Friallaf* (*Friðleif*) і ўрэшце дзевятнаццаты — *Voden* (*Óðin*) [1, с. 3–5].

Накірунак вандроўкі Асаў на чале з Одзінам дакладна вызначаецца Сноры Стурлусанам у "*Ynglinga saga*" (1220–1230) са зборніка "*Heimskringla*". Там сцвярджаецца, што прамежкавым прыстанкам для выхадцаў з Фракіі стала "***Вялікая, альбо Халодная Швецыя***" ("*Svíþjóð in mikla eða in kalda*") дзесьці ў Паўночным Прычарнамор'і. Гэтая мясцовасць, здавалася б, лакалізавана ў творы дастаткова дакладна, месцячыся ля вусця ракі Танаіс: "*Or norðri frá* ***fjǫllum þeim, er fyrir útan eru byggð alla, fellr á um Svíþjóð, sú er at réttu heitir Tanais, hon var forðum kǫlluð Tanakvísl eða Vanakvísl; hon kømr til sjávar inn í*** *Svarta-haf. Í Vanakvíslum var þá kallat Vanaland eða Vanaheimr. Sú á skilr heimsþriðjungana; heitir fyrir austan Ásíá, en fyrir vestan Európá. Fyrir austan* ***Tanakvísl í Ásíá var kallat Ásaland eða Ásaheimr, en hǫfuðborgin, er var í landinu, kǫlluðu þeir Ásgarð.*** *En í* ***borginni var hǫfðingi sá, er Óðinn var kallaðr*** <…>"[1] [2, с. 4]. І ўжо адсюль, з Азіі, Одзін вядзе Асаў далёка на поўнач Еўропы, дзе ўсталёўвае сваю ўладу над скандынавамі і германцамі.

Літаральнае разуменне такой спецыфічнай інтэрпрэтацыі рэальнага гістарычнага працэсу, як ужо адзначалася, практычна не знайшло падтрымкі сярод найбольш аўтарытэтных даследчыкаў германа-скандынаўскай архаікі, з якіх у гэтым кантэксце найперш можна вылучыць Андрэаса Хойслера [3, с. 39, 52, 54], Марціна Нінка [4, с. 5], Якаба Хаўэра [5, с. 149], Жоржа Дзюмезіля [6, с. 13], а таксама Джона Ліндау [7, с. 53]. Бернхард Салін, наадварот, лічыў факт вандроўкі Асаў з Азіі ў Цэнтральную Еўропу досыць верагоднай падзеяй [8, с. 148–149], аднак далейшае сваё развіццё гэты накірунак інтэрпрэтацыі нардычнага міфа, на вялікі жаль, атрымаў пераважна ў рэчышчы рамантычнага негацыянізму, увасобіўшыся ў жанравыя мадыфікацыі папулярнай культуры. Тут перш за ўсё трэба згадаць канцэпцыю Уладзіміра Шчарбакова, які лічыў, што нардычныя Асы першапачаткова паходзяць з Алтая, адкуль яны спачатку патрапілі ў Парфію, а пасля засялілі Прычарнамор'е, дзе атаясняюцца ім з сармата-аланскімі плямёнамі. З Прычарнамор'я пэўная частка гэтага насельніцтва была выцеснена на захад гунамі (IV ст. н. э.), дзе змяшалася з германскім насельніцтвам. Ванамі, у сваю чаргу, даследчык лічыў былых жыхароў Урарту, ад якіх нібыта паходзілі венеты, што з часам трансфармаваліся ў венедаў, а потым у славян-вяцічаў [9]. Эпохай Мітрыдатавых войнаў (89–63 гг. да н. э.) датуе вандроўку атаясненых з сучаснымі асяцінамі Асаў, з нізоўяў Дона на поўнач Еўропы, Тур Хейердал, які

[1] < З паўночных гор, што знаходзяцца па-за населеным светам, праз Вялікую Швецыю цячэ рака, што зараз правільна называецца Танаіс, вядомая раней як Танаквісл і Ванаквісль, і якая трапляе ў Чорнае мора. Краіна людзей на Ванаквісле звалася Ваналанд альбо Ванахайм; і рака падзяляе дзве трацiны свету, з якіх самая ўсходняя называецца Азія, а заходняя — Еўропа. Краіна на ўсход ад Танаквісла ў Азіі завецца Асаланд ці Асахайм, і галоўны горад на гэтай зямлі быў названы Асгардам. У гэтым горадзе быў уладар па імені Одзін <…>>.

лакалізаваў Асгард ля сучаснага горада Азоў[1], а нашчадкамі Ванаў лічыў аднайменнае племя, што насяляла ваколіцы возера Ван[2] [10]. Дзесьці ў раёне сучаснага Азова і былой грэчаскай калоніі Танаіс[3] "размяшчала" Асаў і Ванаў германскіх паданняў і Брыта Верхаген (Альберта Ромель), пры гэтым Асаў яна атаясняла з саўраматамі, альбо меотамі, а Ванаў — з грэчаскімі каланістамі Танаіса. Міграцыя Одзіна на поўнач пры гэтым датавалася прыкладна сярэдзінай I тыс. да н. э. [11].

У гэтым кантэксце неабходна адзначыць вельмі істотную акалічнасць: усе згаданыя прыхільнікі еўгемерычнага дыскурсу нардычнай архаікі засяроджваюць сваю ўвагу толькі на спробах "азоўскай" лакалізацыі Асгарда, цалкам ігнаруючы пры гэтым іншы кампанент генеалагічнага наратыва Сноры Стурлусана — траянскае паходжанне саміх Асаў. Прычыну падобнай непаслядоўнасці няцяжка заўважыць. Менавіта веліч Трої цара Прыяма лічылася гістарычным прэцэдэнтам велічы Рымскай Імперыі, нібыта заснаванай траянцамі, што адлюстраваў Вяргілій у сваёй паэме "*Aeneidos*" (I ст. да н. э.). З цягам часу і сам Рым стаў зіхоткім ідэалам для варварскіх каралеўстваў Еўропы ранняга Сярэднявечча, і верагодна таму спачатку Нэній у "*Historia brittonum*" (IX ст. н. э.), а потым і Гальфрыд Манмуцкі ў "*Historia Regum Britanniae*" (XII ст. н. э.) выводзяць радавод кельцкіх каралёў Брытаніі ад Брута Траянскага — прамога нашчадка траянца Энея, што ў свой час нібыта заснаваў Рым. Між тым брытанская традыцыя тут не была найстарэйшай, бо яшчэ ў VII ст. н. э. франкскі летапісец, так званы Фрэдэгар Схаластык, а ў VIII ст. н. э. яго ананімныя наступнікі ў "*Liber historiae Francorum*" ("*Gesta rerum Francorum*") звязвалі пачаткі франкскай дзяржаўнасці з "высакароднай" траянскай "спадчынай". Так, паводле пераканання гэтых франкскіх храністаў, іх старажытныя каралі паходзілі ад былых траянцаў, што спачатку мусілі ратавацца ад грэкаў на берагах Танаіса і Меатыды, а пасля пасяліліся ў Паноніі (LHF, 1): "*Principium regum Francorum eorumque origine vel gentium illarum ac gesta proferamus. Est autem in Asia opidum Troianorum, ubi est civitas quae Illium dicitur, ubi regnavit Aeneas. Gens illa fortis et valida, viri bellatores atque rebelles nimis, inquieta certamina obiurgantes, per gyrum finitima debellantes. Surrexerunt autem reges Grecorum adversus Aeneam cum multo exercitu pugnaveruntque contra eum cede magna, corruitque illie multum populus Troianorum. Fugiit itaque Aeneas et reclusit se in civitate Illium, pugnaveruntque adversus hanc civitatem annis decim. Ipsa enim civitate subacta, fugiit Aeneas tyrannus in Italia locare gentes ad pugnandum. Alii quoque ex principibus, Priamus videlicet et Antenor, cum reliquo*

[1] Азоў (рус. *Азов*) — горад на паўднёвым беразе Дона (47°06'00"N, 39°25'00"E), раённы цэнтр Растоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі.

[2] Ван (тур. *Van Gölü*, арм. *Վան լիճ*, курд. *Gola Wanê*) — возера на Армянскім нагор'і ў сучаснай Усходняй Турцыі (38°36'57"N, 42°51'57"E).

[3] Танаіс (грэч. *Τάναϊς*) — грэчаская калонія, заснаваная ў III ст. да н. э. выхадцамі з Баспорскага царства на паўночным беразе аднаго з рукавоў ракі Танаіс (47°16'14"N, 39°20'29"E).

*exercitu Troianorum duodecim milia intrantes in navibus, abscesserunt et venerunt usque ripas Tanais fluminis. Ingressi Meotidas paludes navigantes, pervenerunt intra terminos Pannoniarum iuxta Meotidas paludes et coeperunt aedificare civitatem ob memoriale eorum apellaveruntque eam Sicambriam; habitaveruntque illic annis multis creveruntque in gentem magnam*"[1] [12, с. 241–242].

У дадзеным выпадку генетычная сроднасць франкскага і скандынаўскага сюжэтаў з'яўляецца відавочнай. Такая сроднасць разглядалася звычайна як адзнака неаспрэчнага ўплыву на Сноры Стурлусана больш ранняй франкскай традыцыі [3, с. 39, 52, 54], якая нібыта і натхніла ісландскага святара на адаптацыю на скандынаўскай глебе амбітнага "траянскага" дыскурсу дзеля мясцовых ідэалагічных патрэб. Тут трэба адзначыць, што Сноры сапраўды не быў творцам канцэпту азіяцкай прарадзімы Асаў, а праз іх і шведскіх манархаў, бо па меншай меры ўжо ў "*Íslendingabók*" Ары Мудрага (1067–1148) у якасці родапачынальніка скандынаўскіх конунгаў фігуруе *Інгві Конунг Туркаў* (*Yngui Tyrkia conungr*) [13, с. 21]. І гэта дае поўныя падставы меркаваць, што ў скандынаваў існаваў аўтаномны сюжэт пра старажытную міграцыю з Азіі на поўнач Еўропы нейкай мілітарнай групы, якім аперыравалі і Ары Мудры, і Сноры Стурлусан. Гэты скандынаўскі сюжэт, трэба адзначыць, вызначаўся не толькі адноснай самастойнасцю, але і значна большай дэталізацыяй у параўнанні з франкскім наратывам. Сярод такіх дэталяў, істотных для рэканструкцыі зыходнай канвы падзей, патрэбна вылучыць перш за ўсё арыгінальны анамастыкон скандынаўскай крыніцы.

Так, нешматлікія імёны персанажаў франкскага наратыву — Эней, Прыям, Антэнор — без аніякіх змен запазычаны з грэчаскай міфалогіі, што, верагодна, сведчыць пра яго другаснасць і істотную залежнасць ад класічнага першаўзору. Героі скандынаўскага сюжэта, наадварот, ніяк у гэтых варунках не звязаны з літаратурнай традыцыяй антычнасці, і гэта тычыцца не толькі антрапонімаў, але і этнонімаў, і харонімаў, і гідронімаў. Іншымі словамі, практычна ўвесь вельмі багаты анамастыкон, прыналежны да скандынаўскага сюжэта аб міграцыі Асаў з Троі да берагоў Танаіса і далей у Скандынавію, мае арыгінальны характар. Між тым якраз разнастайнасць і арыгінальнасць гэтай анамастыкі лічыліся крытыкамі еўгемерызму следствам этымалагічных спекуляцый, нібыта практыкаваных Сноры Стурлусанам дзеля актуалізацыі

[1] <Хачу распавесці пра пачаткі, паходжанне і дзеянні франкскіх каралёў і іх народаў. У Азіі знаходзіцца горад траянцаў, што завецца Іліум, і правіў там Эней. Народ быў мужны і моцны, мужы былі поўныя неўтаймаванай ваяўнічасці і вялі бесперапынныя войны, пакуль не падначалілі сабе мясцовыя народы. Тады ўзняліся каралі Грэцыі з вялікім войскам супраць Энея і біліся з ім у жахлівай бітве і шмат народа траянцаў загінула там. Эней збег адтуль і зачыніўся ў Іліуме, яны ж ваявалі за гэты горад дзесяць год запар. Калі ж яны ўрэшце захапілі яго, тыран Эней збег і перасяліў свой народ для змагання ў Італію. Іншыя ж князі, як то Прыям і Антэнор, пагрузілі парэшткі войска, дванаццаць тысяч чалавек, на караблі і прывялі іх да берагоў Танаіса. Яны прайшлі праз багны Меятыды, адкуль прыйшлі ўрэшце ў Панонію і пабудавалі горад, якому далі ў гонар сваіх продкаў назву Сікамбрыя. Там жылі яны шмат год і сталі вялікім народам>.

статуснай міфалагемы высакародных продкаў-прыхадняў: "<...> *Сноры аперыруе тэрмінамі геаграфіі і гісторыі <...> але гэтая тэрміналогія тут з'яўляецца сумніўнай: Сноры лічыць сябе гісторыкам і генеолагам, і ён дзейнічае, як ірландскія манахі Высокага Сярэднявечча, што ахвотна гістарызавалі інфармацыю, узятую ад друідаў і паганскіх філідаў. Яны навучылі яго сваёй лацінскай эрудыцыі, запазычваючы свае галоўныя аргументы са слоўнай гульні, з сугучча імёнаў карэнных народаў з біблейскімі ці класічнымі імёнамі <...>. Сноры робіць тое ж самае. Ён не толькі атаясняе багоў са смертнымі конунгамі, што перамагалі адзін аднаго, рухаліся, мігравалі, заваёўвалі. Ён таксама лакалізуе на мапе вядомага свету боскія расы, ачалавечаныя пры дапамозе каламбураў, некаторыя з якіх выдатныя (Æsir — Asia), а іншыя менш удалыя (Vanir — *Vana-kvísl — Tanaïs, "рака Дон"). Ён першапачаткова лакалізуе Асаў і Ванаў на берагах Чорнага мора ля вусця Дона, але прычынаю таму выступае не цьмяная памяць пра нейкую міграцыю і не інфармацыя пра вялікі камерцыйны маршрут, што вёў з Крыма ў Скандынавію, але проста чароўнасць гульні гукаў у эпоху, калі такая квазіэтымалагічная гульня слоў з'яўлялася прымальнай у якасці гістарычнага аргумента*" [6, с. 13]. Згадваючы тут "*каламбуры*" і "*квазіэтымалагічную гульню слоў*" як асноўны інструментарый міфатворчай метадалогіі Сноры Стурлусана, Жорж Дзюмезіль вылучае найперш семантычную пару Асы — Азія (*Æsir* — *Asia*), катэгарычна аспрэчваючы існаванне нейкай этымалагічнай сувязі паміж яе элементамі. Між тым падобнага роду катэгарызм у дадзеным кантэксце выглядае калі не легкаважным, то празмерным.

Так, вызначэнне этымалогіі харонім *Азія*, які ўвялі ў агульны ўжытак грэкі (*Ἀσία*), дагэтуль з'яўляецца пытаннем дыскусійным. Тут найбольшай папулярнасцю вызначаецца пункт гледжання Эміля Форэра, паводле якога сваю сучасную назву спачатку Усходняя Эгеіда, а потым і ўся частка свету на ўсход ад Грэцыі набыла ад хароніма *Асува* (*Aššuwa*). Менавіта так называлася царства, у якім "<...> *трэба бачыць першае дзяржаўнае ўтварэнне фрака-фрыгійцаў у Малой Азіі*" [14, с. 114]. Яно ўяўляла сабой канфедэрацыю дваццаці двух дробных заходнеанаталійскіх палітычных утварэнняў з Трояй (*Taruiša*) і Іліёнам (*Wiluša*) уключна, якая месцілася на тэрыторыі пазнейшых Лідзіі, Місіі, Траады, Малой Фрыгіі, Паўднёвай Фрыгіі, Прапантыды і Паўночнай Карыі [15, с. 95–96]. Асуўская канфедэрацыя стварылася для супрацьстаяння Хецкай імперыі, але ўрэшце была пераможаная хетамі недзе ў XIII ст. да н. э. у перыяд праўлення Тудхаліі IV (каля 1250–1230 гг. да н. э.) [15, с. 122–128].

Усе гэтыя звесткі вынікаюць з таблічак Багазкёйскага архіва, што былі раскапаны толькі ў 1906 г. і праз пэўны час сталі здабыткам шырокай навуковай супольнасці. Між тым Сноры Стурлусан, узнаўляючы ў XIII ст. н. э. племянную гісторыю Асаў з эпічнага Траянскага царства, досыць дакладна апісвае форму дзяржаўнага ўладкавання рэальнай Асувы як канфедэрацыі шэрагу дробных

палітычных утварэнняў на чале з мясцовымі дынастамі: "*Nær miðri verǫldini var gǫrt Þat hús ok herbergi, er ágætast hefir verit, er kallat er Trója <...> Þar váru xii. konungdómar ok einn yfirkonungr <...>*"[1] [1, с. 3–4]. Ужо гэта дае падставы абудзіць пэўны давер да інфармацыі ісландскага сярэднявечнага пісьменніка. І тым большую ўвагу ў дадзеным кантэксце прыцягвае да сябе інфармацыя, што менавіта ад аднаго з такіх дванаццаці дынастаў-"*конунгаў*" — Мунана, альбо Менана (*Múnón еда Mennón*) — уласна і паходзіць Одзін, правадыр Асаў, што прывёў іх спачатку з Фракіі на берагі Танаіса, а потым — у Скандынавію.

Этымалогія старажытнага харонiма *Aššuwa*, у сваю чаргу, з найбольшай верагоднасцю грунтуецца на ад'ектыве ад лувійскага (*resp.* індаеўрапейскага) *aśuwa* 'конь', у выніку чаго Асува — "*краіна, слынная конегадоўляй*" [15, с. 54]. У такім выпадку Асы — гэта альбо 'выхадцы з Асувы', альбо 'коннікі', што пасяліліся на ўсходнім беразе Танаіса, які спачатку ў вачах мясцовых Ванаў верагодна быў "асійскім", а пазней у выніку другаснай этымалагізацыі пераўкшталтаваўся ў азіяцкі. І гэта дае некаторыя падставы меркаваць, што, ствараючы свой варыянт нардычнай этнагоніі, Сноры Стурлусан абапіраўся на пэўную аўтэнтычную вусную традыцыю пра міграцыю ў Скандынавію з Паўночнага Прычарнамор'я нейкай суперстратнай мілітарнай групы.

Для больш пэўнай ідэнтыфікацыі гэтай групы істотнае значэнне маюць таксама і іншыя прыведзеныя Сноры Стурлусанам у "*Snorra-Edda*" і "*Ynglinga saga*" дэталі, што адсутнічаюць у франкскім этнаганічным наратыве. Перш за ўсё тут трэба вылучыць згадку пра Фракію як месца нараджэння Одзіна, топіку, звязаную з супольнасцю Ванаў, а таксама прыватныя асаблівасці прасторавай лакалізацыі Асгарда. Гэтая лакалізацыя дакладна звязваецца Сноры Стурлусанам з вусцем Танаіса, і менавіта гэтая акалічнасць служыла адпраўным пунктам для большасці спроб еўгемерычных рэканструкцый сюжэта пра міграцыю Асаў.

***

Дакладная ідэнтыфікацыя ракі, абазначанай Сноры Стурлусанам як *Танаіс*, выклікае пэўныя цяжкасці, бо антычныя географы і гісторыкі блыталі між сабой Северскі Данец[2] і Дон[3], аддаючы пры гэтым перавагу першаму. І, нарэшце, такая няпэўнасць у дадзеным выпадку не носіць прынцыповага характару, бо пасля зліцця гэтыя рэкі ўтвараюць агульнае рэчышча даўжынёй больш за 200 км, якое ўласна і ўпадае ў Азоўскае мора.

---

[1] <Блізу сярэдзіны зямлі быў пабудаваны горад, што набыў вялізную славу. Ён зваўся тады Троя <...>. Было там дванаццаць дзяржаў, і быў адзін вярхоўны ўладар <...>>.

[2] Северскі Данец (рус. *Северский Донец*; укр. *Сіверський Донець*, грэч. *Τάναις*) — рака ў Расіі і Украіне даўжынёй 1053 км, правы прыток Дона, які выцякае з Сярэднярускага ўзвышша (50°57'52"N, 36°54'09"E) і ўпадае ў Дон у 218 км ад яго ўпадзення ў Азоўскае мора (47°36'02"N, 40°53'50"E).

[3] Дон (рус. *Дон*; грэч. *Τάναις*) — рака ў Расіі даўжынёй 1870 км, вытокі якой знаходзяцца ў паўночнай частцы Сярэднярускага ўзвышша (54°00'44"N, 38°16'40"E), а вусце — у Таганрогскай затоцы Азоўскага мора (47°05'11"N, 39°14'19"E).

Этымалогія гідроніма *Танаіс* грунтуецца на арыйскім корані ***dānu-* ‘рака’[1] [16, с. 528; 17, с. 244], да якога ў дадзеным выпадку дадалася індаеўрапейская аснова **u̯eis-* ‘сачыцца, павольна цякчы’[2] [18, с. 207], што ў выніку *(*dānu-+*u̯eis-)*[3] давала значэнне ‘ціхаплынная рака’[4]. Акрамя таго, Сноры Стурлусан падае яшчэ два гідронімы, генетычна звязаныя з Танаісам, — *Tanakvísl* і *Vanakvísl*. Пры гэтым прынцыповае значэнне набывае сам характар такой сувязі, бо адпаведны пасаж Сноры Стурлусана (“<...> *Tanais, hon var forðum kǫlluð Tanakvísl eða Vanakvísl; hon kømr til sjávar inn í Svarta-haf*”) у залежнасці ад інтэрпрэтацыі злучніка *eða*[5] можа мець два адрозныя варыянты прачытання: a) “<...> *рака* <...> ***Танаіс, вядомая раней як Танаквісл альбо Ванаквісл; яна ўпадае ў Чорнае мора***”; b) “<...> ***рака*** <...> ***Танаіс, вядомая раней як Танаквісл і Ванаквісл; яна ўпадае ў Чорнае мора***”. У выніку гідронімы Танаквісл і Ванаквісл могуць быць: a) двума раннімі варыянтамі назвы адной ракі, якая пазней стала вядомая як Танаіс; b) дзвюма назвамі двух адносна розных гідралагічных аб’ектаў, вядомых пазней у сукупнасці як рака Танаіс. Падобна на тое, што ў дадзеным выпадку большай верагоднасцю вызначаецца менавіта другі варыянт.

Так, агульным фармантам гідронімаў *Tanakvísl* і *Vanakvísl* з’яўляецца скандынаўская лексема *kvísl*, асноўная семантыка якой — ‘рукаў ці разгалінаванне ракі’ (англ. *the fork of a river*) [20, с. 365; 19, с. 255], а факультатыўная — ‘вусце ракі’ (англ. ‘***the mouth of a river***’) [20, с. 365]. Акрамя таго, Ванаквісл трывала звязаны з захадам і зямлёй Ванаў, а Танаквісл, наадварот, з усходам і зямлёй Асаў: “*Í Vanakvíslum var þá kallat Vanaland eða Vanaheimr. Sú á skilr heimsþriðjungana; heitir fyrir austan Ásíá, en fyrir vestan Európá. Fyrir austan Tanakvísl í Ásíá var kallat Ásaland eða Ásaheimr, en* ***hǫfuðborgin, er var í landinu, kǫlluðu þeir Ásgarð***”[6] [2, с. 4]. Гэта дае падставы меркаваць, што Ваны і Асы жылі ў дэльце старажытнага Танаіса, падзеленага на два асноўныя рэчышчы — Ванаквісл і Танаквісл.

У такіх варунках не выклікае асаблівага здзіўлення, што еўгемерысты шукалі Асгард менавіта ў сучаснай дэльце ракі Дон, на адным з рукавоў якой

[1] Ян Развадоўскі тлумачыў чаргаванне *d* / *t* у гэтым гідроніме ўплывам кімерыйскай мовы [16, с. 528–529].

[2] Параўн. з этымалогіяй гідронімаў кшталту Вісла, Свіслач, Іслач.

[3] Параўн. з гідронімам Дунай / *Danuvius*.

[4] Перапад вышынь паміж вытокам і вусцем Северскага Данца складае 195 м, а сярэдні ўхіл — 0,18 м/км. У выніку хуткасць плыні ракі крайне невысокая, і на некаторых участках блізкая да нуля. Падобныя паказчыкі для Дона яшчэ меншыя: перапад вышынь — 180 м, сярэдні ўхіл — 0,096 м/км.

[5] Як правіла, у старажытнаісландскай мове злучнік *eða* перакладаўся як ‘альбо’ (англ. *or*), але ў тым выпадку, калі параўноўваліся дзве разнайменныя рэчы, ён мог перакладацца як ‘і’ (англ. *and*) [19, с. 102].

[6] <Краіна людзей на Ванаквісле звалася Ваналанд альбо Ванахайм; і рака падзяляе дзве траціны свету, з якіх самая ўсходняя называецца Азія, а заходняя — Еўропа. Краіна на ўсход ад Танаквісла ў Азіі завецца Асаланд ці Асахайм, і галоўны горад на гэтай зямлі быў названы Асгардам>.

размяшчалася калісьці старажытная грэчаская калонія Танаіс, а на другім — паселішча, на рацэ Азоўка[1], вядомае зараз як Азоў. Натуральна, існавала вялікая спакуса атаясніць грэчаскую калонію Танаіс на сучасным Мёртвым Данцы[2] з Ванахаймам, а Азоў на рэчышчы ўласна Дона, вядомага таксама як Стары Дон[3], адпаведна з Асахаймам і Асгардам. Тым больш што ранейшай назвай паселішча Азоў была Тана, у выніку Азоў / Асгард нібыта сапраўды стаяў на Танаквісле — ‘рукаве Таны’. Між тым прыняць такую канцэпцыю перашкаджае шэраг істотных акалічнасцей.

Перш за ўсё тут трэба адзначыць, што грэчаская калонія Танаіс і паселішча Тана / Азоў належаць да вельмі розных эпох і ніяк не маглі быць цэнтрамі нейкага гіпатэтычнага кроскультурнага кантакту паміж Ванамі і Асамі. Грэчаскі горад Танаіс быў заснаваны выхадцамі з Баспорскага царства недзе ў III ст. да н. э.[4] на правым беразе Мёртвага Данца, які тады з’яўляўся асноўным рэчышчам ракі Танаіс. Калонія праіснавала да V ст. н. э., пакуль не прыйшла ў канчатковы заняпад пад націскам стэпавых намадаў, і толькі ў канцы XII ст. н. э. венецыянцы пабудавалі новы гандлёвы фарпост пад назвай Тана на новым месцы, аднесеным прыкладна на 15 км на паўднёвы ўсход ад колішніх руінаў старажытнай грэчаскай калоніі. Гэты перанос тлумачыўся тым, што да таго часу Дон змяніў сваё асноўнае рэчышча, у якое ператварыўся самы паўднёвы рукаў дэльты, вядомы як Стары Дон, на беразе якога і з’явілася Тана. Праз пэўны час венецыянцы перадалі сваю факторыю генуэзцам, і ўжо пад іх кантролем яна праіснавала да 1475 г., пакуль яе ўрэшце не захапілі і не разбурылі туркі. Туркі, у сваю чаргу, зусім побач з былой Танай пабудавалі новую крэпасць, якой далі назву Азак[5]. Этымалогія гэтага астыёніма грунтуецца на ўсходнецюркскім *azak* ‘нізіна’ [16, с. 63], што, трэба адзначыць, досыць дакладна апісвае асаблівасці мясцовага ландшафту (0 м над узроўнем мора).

Так, Мёртвы Данец наўрад ці быў Ванаквіслам, а Стары Дон — Танаквіслам, горад Танаіс — сталіцай Ваналанда, а Тана / Азак / Азоў — Асгардам. Між тым актуальным застаецца тое, што Ваны і Асы сапраўды жылі ў дэльце старажытнага Танаіса, падзеленага на два асноўныя рэчышчы — Ванаквісл і Танаквісл. Але дэльта гэтая знаходзілася зусім у іншым месцы, што досыць акрэслена засведчыў сам Сноры Стурлусан.

---

[1] Азоўка (рус. *Азовка*) — рэчка ў Расіі даўжынёй 11 км, левы прыток Дона. Часткова працякае праз горад Азоў. Выток: 47°04'54"N, 39°31'57"E; вусце: 47°06'59"N, 39°25'39"E.

[2] Мёртвы Данец (рус. *Мёртвый Донец*) — самы паўночны рукаў дэльты Дона, што яднае асноўнае рэчышча з паўночнай часткай Таганрогскай затокі. Выток: 47°11'11"N, 39°37'49"E; вусце: 47°16'05"N, 39°13'23"E.

[3] Уласнае рэчышча Дона з’яўляецца самым паўднёвым рукавом дэльты гэтай ракі.

[4] Аналіз ганчарных клеймаў на артэфактах гэтага помніка дазваляе датаваць заснаванне Танаіса канцом першай чвэрці III ст. да н. э. [21, с. 160].

[5] Магчыма, такая назва неафіцыйна існавала і раней, але ў любым выпадку яна ўзнікла не раней за другую трэць XIII ст., калі ў стэпавых перадгор’ях Каўказа і нізоўях Дона з’явіліся цюркі.

Так, лакалізуючы азіяцкую прарадзіму Асаў, ісландскі храніст вызначае, што Танаіс упадае менавіта ў Чорнае мора: “<…> ***Tanais, hon var forðum kǫlluð*** *Tanakvísl eða Vanakvísl; hon kømr til sjávar inn í Svarta-haf*”[1] [2, с. 4]. Прычым дэльта Танаіса ў “*Ynglinga saga*” мае дакладную мерыдыянальную арыентацыю, бо Ванаквісл і Танаквісл цякуць уздоўж восі поўнач–поўдзень, у выніку чаго Ваны жывуць на заходнім еўрапейскім беразе гэтай падвоенай плыні, а Асы — на ўсходнім азіяцкім: “*Í Vanakvíslum var þá kallat Vanaland eða Vanaheimr. Sú á skilr heimsþriðjungana; heitir fyrir austan Ásíá, en fyrir vestan Európá. Fyrir austan* ***Tanakvísl í Ásíá var kallat Ásaland eða Ásaheimr, en hǫfuðborgin, er var í landinu, kǫlluðu þeir Ásgarð***”[2] [2, с. 4]. Гэта карэнным чынам супярэчыць надзённым рэаліям, звязаным з дэльтай ракі Дон, якімі, уласна, і аперыравалі ўсе прыхільнікі еўгемерычнай канцэпцыі. Дон, як вядома, пасля зліцця з Северскім Данцом цячэ з усходу на захад і ўпадае ў Азоўскае мора, што робіць магчымым лакалізацыю Ванаў і Асаў толькі ўздоўж восі поўнач–поўдзень.

Натуральна, падобную неадпаведнасць можна паспрабаваць патлумачыць кепскім веданнем сярэднявечным скандынаўскім міфографам рэалій прычарнаморскай гідралогіі, заснаваным на некрытычным запазычанні памылковых звестак з твораў ірландскіх манахаў [6, с. 13]. Так, па меншай меры адзін з гэтых манахаў — Дыкуіл (IX ст. н. э.) — у сваім творы “*De mensura Orbis terrae*” (*Dicv.* VI. 42) выказвае перакананасць, што Танаіс, урэшце рэшт мінаючы “***Меатыйскія балоты***”, сапраўды ўпадае ў Понт Эўксінскі: “*Fluvius Tanais nascitur in monte Hyperborei Riphei. per Meotidas paludes exiens influit in Euxinum Pontum*”[3] [22, с. 37]. Аднак між тым такой жа “некампетэнтнасцю” ў гэтым пытанні вызначаюцца і творы тых аўтараў, што бачылі сітуацыю на свае вочы ці ведалі з першых вуснаў. Так, Флавій Арыян (86–160 гг. н. э.) у “***Περιπλουσ Ευξεινου Ποντου***” (*Arr.*, 29) адзначае: “***Ἐνθένδε ἐπὶ Τάναϊν ποταμὸν ἐξήκοντα ὃς λέγεται ὁρίζειν ἀπὸ τῆς Ἀσίας τὴν Εὐρώπην. καὶ ὁρμᾶται μὲν ἀπὸ λίμνης τῆς Μαιώτιδος, ἐσβάλλει δὲ εἰς θάλατταν τὴν τοῦ Εὐξείνου Πόντου***”[4] [24, с. 394]. Прычым падобны погляд рэпрэзентуецца зусім не як нейкі гіпатэтычны вынік “кабінетных адшуканняў”, а як будзённая фіксацыя мясцовых рэалій. Флавій Арыян, рымскі легат Кападокіі, асабіста ажыццявіў кабатажнае плаванне ўздоўж чарнаморскага ўзбярэжжа, таму выкладаў плён уласнага досведу, многія ж з іншых аўтараў, у сваю чаргу,

[1] <<…> рака <…> Танаіс, вядомая раней як Танаквісл і Ванаквісл; яна ўпадае ў Чорнае мора>.

[2] <Краіна людзей на Ванаквісле звалася Ваналанд альбо Ванахайм; і рака падзяляе дзве траціны свету, з якіх самая ўсходняя называецца Азія, а заходняя — Еўропа. Краіна на ўсход ад Танаквісла ў Азіі завецца Асаланд ці Асахайм, і галоўны горад на гэтай зямлі быў названы Асгардам>.

[3] <Рака Танаіс бярэ пачатак на Рыпейскіх гарах у Гіпербарэі. Яна ўпадае ў Понт Эўксінскі, прайшоўшы праз Меатыйскія балоты>.

[4] <Што тычыцца ракі Танаіс, то яна, як кажуць, падзяляе Еўропу і Азію. Яна выцякае з Меатыйскага балота і ўпадае ў мора Понта Эўксінскага>. Гэты ж урывак без змен цытуе ў сваім творы “*Περιπλουσ Ευξεινου Ποντου*” (*Ps.-Arr.*, 43) і Псеўда-Арыян (V ст. н. э.) [23, с. 412].

спасылаюцца на інфармацыю, атрыманую непасрэдна ад мясцовых жыхароў. Так, Евагрый Схаластык (VI ст. н. э.) у “*Ἐκκλησιαστικὴ Ἱστορία*” (*Ev. Sch.* IV. 23) сведчыць, што “<…> *Танаісам тубыльцы называюць пратоку, якая ідзе з Меатыйскага балота ў Эўксінскі Понт* <…>” (“<…> *Τάναϊν δὲ καλοῦσιν οἱ ἐπιχώριοι τὴν τῆς λίμνης τῆς Μαιώτιδος ἐκβολὴν ἄχρις ἐς τὸν Εὔξεινον Πόντον* <…>”) [25, с. 170]. Пракопій Кесарыйскі (VI ст. н. э.), падобна да таго, сцвярджае ў “*Ιστορία των Πολέμων*” (*Proc. Caes.* VIII. IV. 7–11): “<…> *μέχρι ἐς τὴν Μαιῶτιν καλουμένην Λίμνην καὶ ποταμὸν Τάναϊν, ὃς δὴ ἐς τὴν Λίμνην ἐςβάλλει. αὕτη δὲ ἡ Λίμνη ἐς τὴν ἀκτὴν Πόντου τοῦ Εὐξείνου τὰς ἐκβολὰς ποιεῖται.* <…> *(Τάναϊν δὲ καλοῦσιν οἱ ἐπιχώριοι καὶ τὴν ἐκβολὴν ταύτην, ἥπερ ἐκ Λίμνης ἄχρι ἐς τὸν Εὔξεινου Πόντον διήκει, ἐς ὁδόν ἡμερῶν, ὥς φασιν, εἴκοσιν. ἀλλὰ καὶ τὸν ἄνεμον ὃς ἐνθένδε πνεῖ Ταναΐτην προσαγορεύουσιν)*”[1] [26, с. 84].

Гэта дае падставы меркаваць, што па меншай меры ў першай палове I тыс. н. э. Меатыда займала значна меншую плошчу за сучасную акваторыю Азоўскага мора, так што з Понтам Эўксінскім яна злучалася не непасрэдна ў раёне Баспора Кімерыйскага, а праз досыць доўгае рачное рэчышча, якое сучаснікі лічылі працягам рэчышча Танаіса. Пры гэтым вусце таго даўняга Танаіса складала адзінае цэлае з Баспорам Кімерыйскім, вядомым зараз як Керчанская пратока[2].



**Малюнак 1**

[1] <<…> да так званага Меатыйскага балота і да ракі Танаіс, якая ўпадае ў балота. Само ж балота злучаецца з Понтам Эўксінскім. <…> (Танаісам мясцовыя жыхары называюць таксама і тую пратоку, якая бярэ пачатак з Меатыйскага балота і цягнецца да Понта Эўксінскага, як кажуць, на дваццаць дзён шляху. А таксама нават вецер, што дзьме тут, яны Танаітай завуць)>.

[2] Керчанская пратока (укр. *Керченська протока*; рус. *Керченский пролив*) — пратока, прыналежная да акваторыі Азоўскага мора, што яднае яго з Чорным морам (45°18'55"N, 36°34'06"E). Заходні бераг — Керчанскі паўвостраў Крыма, усходні — Таманскі паўвостраў. Шырыня пратокі вагаецца ад 4,5 да 15 км.

У часы глыбокай старажытнасці Азоўскага мора не існавала ўвогуле. Тагачасны Дон — палеа-Дон — сапраўды ўпадаў у Чорнае мора ў раёне сучаснай Керчанскай пратокі, пакуль, у адпаведнасці з тэорыяй чарнаморскага патопу, не здарыўся катастрафічны землятрус. У выніку гэтага катаклізму ў Чорнае мора, што было тады вялікім прэснаводным возерам, прарвалася вада з Міжземнага мора, у выніку чаго яго ўзровень узняўся на 140 м, а пойма Дона, прылеглая да вусця ракі, затапілася, ператварыўшыся ў мелкаводнае Азоўскае мора[1] альбо гіганцкі ліман. Сноры Стурлусан, канешне, ніяк не мог адлюстраваць "дапатопны" стан рэчаў, бо згаданы катаклізм датуецца дзесьці 5600 г. да н. э., але, тым не менш, скандынаўскі міфограф вельмі дакладна адлюстраваў наступствы іншага працэсу, відавочцы якога здолелі пакінуць пэўныя звесткі пра яго.

Дадзены працэс вядомы зараз як фанагарыйская рэгрэсія. Пад рэгрэсіяй тут разумеецца зніжэнне ў сілу розных прычын узроўню мора адносна берагоў. Сваю назву працэс атрымаў ад горада Фанагорыя[2] — калоніі, заснаванай грэкамі на беразе Баспора Кімерыйскага ў 543 г. да н. э. Зараз значная частка руінаў гэтага помніка знаходзіцца пад вадой, што з'яўляецца відавочным паказчыкам істотнага павышэння сучаснага ўзроўню мора ў гэтым рэгіёне ў параўнанні з эпохай Вялікай грэчаскай каланізацыі.

Фанагарыйская рэгрэсія па радыевугляроду датуецца VII–II стст. да н. э. (2,7–2,1 тыс. г. т.) [27, с. 111] і ўяўляе сабой "*адну з фаз пасляледніковай трансгрэсіі Чорнага мора. Яна змяніла новачарнаморскую трансгрэсію і сама, у сваю чаргу, змянілася німфейскай трансгрэсіяй, за якой надышла корсуньская рэгрэсія, пасля чаго ўзровень мора ўзняўся да сучаснага і працягвае паступова павышацца*" [28, с. 21]. Перыядычнасць і заканамернасць такога працэсу не была вялікай таямніцай ужо для людзей антычнага свету. Прынамсі, гэта адлюстраваў Арыстоцель (384–322 гг. да н. э.) у "*Μετεωρολογικα*" (*Aristot. Meteor.* I. XIV. 1–6), калі пісаў, што адны і тыя ж вобласці не застаюцца назаўсёды сухімі альбо вільготнымі, але змяняюцца ў залежнасці ад з'яўлення ці вычарпання рэк. Так, калі мясцовасць робіцца сушэйшай, то крыніцы знікаюць, і рэкі спачатку з вялікіх робяцца маленькімі, а потым высыхаюць канчаткова, а потым перамяшчаюцца ў іншыя месцы. У выніку і мора церпіць змены: там, дзе яно, насычанае рэкамі, спачатку наступала на бераг, неўзабаве адступае назад, пакінуўшы сухую зямлю; а там, дзе мора з-за рачных наносаў высыхае, там праз пэўны час зноў з'яўляюцца купінкі вады. Падобным чынам мора і суша мяняюцца месцамі, бо там, дзе была суша, узнікае мора, а дзе зараз

[1] Азоўскае мора, сярэдняя глыбіня якога складае 8 м, а максімальная – 15 м, лічыцца самым мелкім у свеце.

[2] Фанагорыя (грэч. *Φαναγόρεια*) — грэчаская калонія на азіяцкім баку Баспора Кімерыйскага (45°16'37"N, 36°57'58"E).

мора — там зноў будзе зямля. Прычым гэтыя перамены адбываюцца ў пэўным парадку і праз пэўныя прамежкі часу [29, с. 53–54].

Разважаючы такім чынам пра фазавы характар гідралагічнага рэжыму пэўных тэрыторый, Арыстоцель (*Aristot. Meteor.* I. XIV. 29) быў перакананы ў незайздросным канчатковым лёсе Меатыды, бо “<…> *гэтае возера таксама спачатку было створана рэкамі і ўрэшце рэшт яно павінна цалкам высахнуць*” (“<…> *ὥστ’ ἐκ τούτου ῥᾴδιον ἀναλογίσασθαι ὅτι καὶ τὸ πρῶτον, ὥσπερ αἱ πολλαὶ τῶν λιμνῶν, καὶ αὕτη ἔργον ἐστὶ τῶν ποταμῶν, καὶ τὸ τελευταῖον πᾶσαν ἀνάγκη γενέσθαι ξηράν*”) [29, с. 60]. Такі песімістычны прагноз грунтаваўся на тым, што ў часы Арыстоцеля (IV ст. да н. э.) Меатыда ў выніку глабальных кліматычных трансфармацый якраз страціла падпітку з боку двух буйнейшых сваіх прытокаў: Танаіса / Дона і Гіпаніса / Кубані. Яна тады лакалізавалася ў раёне “<…> *падводнага схілу паўночнага ўзбярэжжа Керчанскага паўвострава і часткова ў цэнтры сучаснага Азоўскага мора* <…>”, існуючы “<…> *за кошт сцёку рэк Таўрыды, Скіфіі, а таксама скіду вод, у тым ліку і засоленых, з падземных гарызонтаў Керчанскага паўвострава і Крымскай горнай краіны*”. У выніку “*ў раннеантычную эпоху* [VIII–IV ст. да н. э. — *С. Д.*] *Меатыйскае возера практычна не злучалася з Понтам Эўксінскім праз Кімерыйскі Баспор* <…>. *Палеа-Дон (р. Танаіс) працякаў па асушанаму дну ўсходняй часткі старажытнага Понта-Каспійскага мора (г. зн. дно сучаснага Азоўскага мора) і ўпадаў у вузкую даліну Кімерыйскага Баспора*”[1]. Прычым, зліваючыся разам з палеа-Кубанню“<…> *палеа-Дон «уцякаў» у вузасць Кімерыйскага Баспора, не кантактуючы з воднай тоўшчай Меатыйскага возера*” [32, с. 164–165].

Вынікі гэтай рэканструкцыі, заснаваныя на аналізе выкапнёвай фауны, сведчаць пра тое, што ў перыяд ранняй Антычнасці рэальнае вусце Танаіса / Дона разам з вусцем Гіпаніса / Кубані ўтваралі тагачасны Баспор Кімерыйскі — пратоку, арыентаваную з поўначы на поўдзень, якая ў адпаведнасці з геаграфічнымі ўяўленнямі Антычнасці падзяляла Еўропу і Азію, што ўжо дае пэўныя падставы меркаваць пра гэты мікрарэгіён як пра легендарную прарадзіму нардычных Асаў.

***

Дадзеная гідралагічная сітуацыя існавала дзесьці да II ст. да н. э., пакуль на змену фанагарыйскай рэгрэсіі не прыйшоў новы, больш вільготны, кліматычны перыяд, вядомы як німфейская трансгрэсія. Галоўным следствам гэтага працэсу стала новае павышэнне ўзроўню вады, у выніку чаго Меатыда зноў атрымала падсілкаванне ад Танаіса. У пачатку I ст. да н. э. гэта зафіксаваў у “*Περιηγησισ*” Псеўда-Скімн, які адзначаў (*Ps.-Chii.*, 866–873): “<…> *Μαιῶτις ἐξῆς ἐστὶ λίμνη κειμένη, // εἰς ἣν ὁ Τάναϊς // <…> // Ἐξίησι δεῖ // δίστομον ἔχων τὸ*

[1] Узровень вады ў Керчанскай пратоцы ў сярэдзіне I тыс. да н. э. быў ніжэйшы за сучасны дзесьці на 4 м [30, с. 88], а паводле некаторых іншых ацэнак — на 10 м [31, с. 43].

*ῥεῖθρον εἰ τὴν λεγομένην // Μαιῶτιν εἰς τὸν Κιμμερικόν τε Βόσπορον*”[1] [33, с. 232]. Так, возера зноў сілкавалася пэўнай часткай моцы вялікай ракі, павялічваючы паступова сваю акваторыю, але нават і ў гэты перыяд Меатыда непасрэдна з Чорным морам пакуль не злучалася. Па меншай меры Палібій, што жыў у II ст. да н. э., адзначаў: “*οὖσά τ’ ἐξ ἀρχῆς θάλαττα σύρρους τῷ Πόντῳ, καθάπερ οἱ παλαιοὶ συμφωνοῦσι, νῦν ἐστι λίμνη γλυκεῖα, τῆς μὲν θαλάττης ἐκπεπιεσμένης ὑπὸ τῶν ἐγχωμάτων, τῆς δὲ τῶν ποταμῶν εἰσβολῆς ἐπικρατούσης*”[2] [34, с. 400, 402]. Між тым Танаіс, застаючыся адносна аўтаномным, меў уласны сцёк у Понт Эўксінскі праз рэчышча Баспора Кімерыйскага.

Пасаж Псеўда-Скімна пра два рукавы Танаіса, адзін з якіх сілкуе ізаляваную багністую і “*салодкую*” Меатыду, а другі поўніць Чорнае мора праз цясніну Баспора Кімерыйскага, можа падацца зручнай падставай для іх атаяснення з Ванаквіслам і Танаквіслам Сноры Стурлусана, але гэта наўрад ці так, бо абодва рэчышчы, апісаныя ісландскім міфографам, мусілі ўпадаць у Чорнае мора, падзяляючы краіны Ванаў і Асаў па восі поўнач–поўдзень. Іншымі словамі, весці размову пра нейкую гістарычную аснову скандынаўскага міфалагічнага наратыву можна толькі ў тым выпадку, калі існаваў нейкі палеафарватар, паралельны Баспору Кімерыйскаму.

Меркаванне пра існаванне падобнага рэчышча яшчэ ў 1996 г. выказаў Юрый Горлаў, які сцвярджаў, што “<…> *сучасны Таманскі паўвостраў* [усходні бераг Керчанскай пратокі. — *С. Д.*] *у сярэдзіне I тыс. да н. э. уяўляў сабой выспу* <…>. *Практычна тут магла існаваць яшчэ адна пратока, якая ў адрозненне ад Баспора з часам стала непраходнай з-за наносаў Кубані*” [35, с. 71–72]. Тут трэба адзначыць, што ўяўленне пра Таманскі паўвостраў раннеантычнага перыяду як пра адасоблены ад асноўнага мацерыка локус даўно не было новым, але гэты локус трывала надзяляўся рысамі дыскрэтнасці. Даў пачатак гэтай традыцыі ў 1843 г. Фрыдэрык Дзюбуа дэ Манперэ, які лічыў, што Тамань у дадзеную эпоху ўяўляла сабой архіпелаг з пяці асобных выспаў, падзеленых шматлікімі пратокамі [36, с. 22], і падобны пункт гледжання доўгі час амаль не аспрэчваўся. Між тым ён, відавочна, быў памылковым.

Найлепшым чынам прадэманстраваў гэта адлюстраваны ў шэрагу публікацый [37; 38; 39] плён работы Баспорскай археалагічнай экспедыцыі Дзяржаўнага Гістарычнага музея РФ сумесна з Еўразійскім аддзелам Германскага археалагічнага інстытута (група ДГМ–DAI), атрыманы ў 2006–2013 гг. у ходзе рэалізацыі праекта вывучэння грэчаскай каланізацыі на Таманскім паўвостраве. Адным з накірункаў гэтага комплекснага даследавання

[1] <<…> Меатыйскае балота побач ляжыць // з Танаісам // <…>. Выліваецца ён // падвоеным рэчышчам у так званую // Меатыду і ў Кімерыйскі Баспор>.

[2] <[Меатыда] была першапачаткова морам, што злівалася з Понтам у адно, як адзінагалосна сведчаць пра гэта старажытныя аўтары, а цяпер гэта — возера салодкай вады, бо марская вада выцеснена з яго наносамі, а тая, што ўліваецца з рэк, атрымала перавагу>.

стала высвятленне палеаландшафтнай сітуацыі на Азіяцкім Баспоры. У выніку экспедыцыя прыйшла да высновы, што палеа-Таманскі архіпелаг быў утвораны адной вялікай і дзвюма малымі выспамі, якія на ўсходзе аддзяляліся ад азіяцкай часткі мацерыка пратокай з марской вадой, што існавала з эпохі Бронзавага веку да перыяду позняй Антычнасці, хоць актыўная навігацыя па гэтай пратоцы была магчыма толькі дзесьці да IV ст. да н. э., калі глыбіня фарватару вагалася ад 2 да 5 м. Прычынай заняпаду гэтага маршруту стаў глей, прынесены Кубанню, што ўпадала ў пратоку разам з Танаісам, а таксама актыўны працэс утварэння пясчаных кос.

Тут неабходна прызнаць, што вынікі найноўшых навуковых даследаванняў толькі пацвярджаюць даныя, прыведзеныя яшчэ антычнымі інфарматарамі, якія, трэба адзначыць, досыць дакладна адлюстравалі сучасны ім стан рэчаў. Так, Псеўда-Скімн, апісваючы ў I ст. да н. э. азіяцкую частку Баспорскай дзяржавы з размешчанымі на ёй грэчаскімі гарадамі, што зараз лакалізаваны на Таманскім паўвостраве, называе яе "*выспай*" з "*прасторнымі землямі*", якая адасоблена ад азіяцкай часткі мацерыка "*багнамі, рэчкамі і затокамі*", а ад еўрапейскай — Баспорам Кімерыйскім (*Ps.-Shii.*, 886–895): "***Εἶτ' ἔστιν Ἑρμώνασσα Φαναγόρειά τε, // <…> // καὶ Σινδικὸς λιμήν, ἔχων οἰκήτορας // Ἕλληνας ἀπὸ τῶν ἐγγὺς ἥκοντας τόπων. // Ταύτας περιέχει τὰς πόλεις διακειμένας // νῆσος, κατὰ τὴν Μαιῶτιν ἄχρι τοῦ Βοσπόρου // χώραν ἀπολαμβάνουσα πολλὴν πεδιάδα, // ἥτις τὰ μὲν τοῖς ἕλεσι καὶ τοῖς ποταμίοις // ἀδιάβατος τοῖς τενάγεσίν τ' ἐν τῷ πέραν, // ἅ δὲ τῇ θαλάττῃ τῇ τε λίμνῃ γίνεται***"[1] [33, с. 233]. Так, ужо ў часы Псеўда-Скімна ці нават раней старажытная марская пратока была занесена глеем і пяском і, па сутнасці, ператварылася ў багну, прычым непасрэдны працэс гэтай трансфармацыі апісаў яшчэ Арыстоцель у IV ст. да н. э., ілюструючы свой тэзіс аб перманентным характары ландшафтных метамарфоз (*Aristot. Meteor*. I. XIV. 30): "***Ἔτι δ' ὁ Βόσποροςὶ ἀεὶ μὲν ῥεῖ διὰ τὸ ῥῖ προσχοῦσθαι, καὶ ἔστιν ἔτι ταῦτα καὶ τοῖς ὄμμασιν ἰδεῖν ὅν τινα συμβαίνει τρόπον˙ ὅτε γὰρ ἀπὸ τῆς Ἀσίας ᾐόνα ποιήσειεν ὁ ῥοῦς, τὸ ὀπίσθεν λίμνη ἐγίνετο μικρὰ τὸ πρῶτον, εἶτ' ἐξηράνθη, μετὰ δὲ τοῦτο ἄλλη ἀπὸ ταύτης ᾐὼν καὶ λίμνη ἀπ' αὐτῆς. καὶ τοῦτο ἀει οὕτω συνέβαινεν ὁμοίως˙ τούτου δὲ γινομένου πολλάκις ἀνάγκη προϊόντος τοῦ χρόνου ὥσπερ ποταμὸν γενέσθαι, τέλος δὲ καὶ τοῦτον ξηρόν***"[2] [29, с. 60–61].

---

[1] <Затым ідуць Германаса і Фанагорыя, // <…> // і Сіндская гавань, што заселена // Элінамі, якія прыйшлі з недалёкіх ваколіц. // Там гэтыя гарады разам ляжаць // на выспе, што цягнецца ўздоўж Меатыды да Баспора, // землі там прасторныя і роўныя, // Але сапраўды багны, рэчкі і затокі // Замінаюць праход з таго боку [з усходу, з боку Сіндыкі. — *С. Д.*], // А з гэтага [з захаду, з боку Крыма. — *С. Д.*] – мора і возера [Понт Эўксінскі і Меатыда. — *С. Д.*]>.

[2] <Дзякуючы наносам, Баспор валодае пастаяннай плынню, і на свае вочы можна бачыць, якім чынам гэта адбываецца: кожны раз, як плынь стварае ў азіяцкага берага водмель, ззаду яе спачатку утвараецца маленькае азярцо, якое затым высыхае, а потым новая водмель утворыцца перад першай і новае возера, і так гэта паўтараецца зноў і зноў. Паколькі гэта паўтараецца часта, з часам Баспор павінен стаць вузкім, як рака, каб нарэшце зусім перасохнуць>.

Выснова пра існаванне ў І тыс. да н. э. яшчэ аднаго, усходняга Баспора, умоўна названага супрацоўнікамі групы ДГМ–DAI "*Баспорам Кубанскім*" у адрозненне ад Баспора Кімерыйскага, досыць прыхільна была прынята спецыялістамі. Сярод іх найперш трэба вылучыць Ігара Сурыкава, які, пагаджаючыся ўвогуле з асноўнай аргументацыяй удзельнікаў расійска-германскага даследчага праекта, прапанаваў між тым іншы варыянт назвы для новаадкрытага фарватара — "*Баспор Сіндскі*", матывуючы гэта тым, што палеапратока аддзяляла палеавыспу менавіта ад Сіндыкі [40, с. 171–172; 41, с. 70–71] — гістарычнай вобласці, што ў І тыс. да н. э. ляжала на поўдзень ад нізоўяў ракі Кубань. Такая прапанова (якая, сапраўды, падаецца больш удалай) выклікала пэўную дыскусію [38, с. 152–153], але ў кантэксце дадзенага даследавання яе вынікі не маюць істотнага значэння, бо, як слушна адзначаюць самі ўдзельнікі Баспорскай археалагічнай экспедыцыі, "<…> *у антычныя часы абедзве пратокі — і Керчанская, і нядаўна адкрыты Баспор Кубанскі разглядаліся сучаснікамі як адзіны — Баспор Кімерыйскі, у цэнтры якога і ляжала выспа (Νῆσος антычных крыніц). <…> Сапраўды, ніякага «Кубанскага Баспора» ў антычных крыніцах няма, але ёсць толькі адзін Баспор Кімерыйскі, які першапачаткова меў два рэчышчы. Адно з гэтых рэчышчаў паступова было занесена, і выспа ператварылася ў сучасны Таманскі паўвостраў*" [39, с. 111–112]. У гэтым яны мусілі пагадзіцца з меркаваннем Ігара Сурыкава, які некалькі раней сцвярджаў: "*Сапраўды, ужо на раннім этапе засваення рэгіёна элінскія каланісты не маглі не ўсвядоміць, што заходняя і ўсходняя пратокі — гэта, па сутнасці, не дзве асобныя пратокі, а два, калі так можна сказаць, "рукавы" (альбо "галіны")*[1] *адной пратокі. Так і магла ўяўляцца дадзеная геаграфічная рэалія: як адзіная пратока Баспор з вельмі вялікай выспай пасярэдзіне*" [40, с. 173]. З падобнай высновай, сапраўды, ніяк не выпадае спрачацца, але з гэтага ж вынікае наступнае: атаясненне антычнымі крыніцамі І тыс. да н. э. вусця Танаіса з Баспорам Кімерыйскім робіць непазбежным атаясненне абодвух яго рэчышчаў — заходняга і ўсходняга — з Ванаквіслам і Танаквіслам адпаведна.

У кантэксце новага разумення рэалій палеаландшафтнай сітуацыі І тыс. да н. э. на берагах Баспора Кімерыйскага атрымлівае дадатковае ўдакладненне і міфалагічная тапаграфія прарадзімы Асаў, прапанаваная Сноры Стурлусанам у "*Ynglinga saga*". Так, ісландскі міфограф дакладна адлюстраваў прыватныя асаблівасці лакалізацыі легендарных боскіх этнасаў на берагах двух рэчышчаў *Танаіса*, бо яго Ваны жывуць на абодвух берагах Ванаквісла ("*Í Vanakvíslum <…>*"[2]), а Асы — толькі на ўсходнім беразе Танаквісла: "*Fyrir austan Tanakvísl í Ásíá var kallat Ásaland eða Ásaheimr, en hǫfuðborgin, er var í*

[1] Тут трэба нагадаць, што менавіта такой семантыкай вызначаецца старажытнаскандынаўская лексема *kvísl* 'рукаў ці разгалінаванне ракі' (англ. *the fork of a river*) [20, с. 365; 19, с. 255].

[2] <На Ванаквісле <…>>.

*landinu, kǫlluðu þeir Ásgarð*”[1] [2, с. 4]. Праекцыя гэтай эмпірэйнай канструкцыі на рэальную глебу лакалізуе ў выніку арэал Ванаў на Керчанскім паўвостраве і Выспе[2], а арэал Асаў атаясняецца ў такім выпадку толькі з Сіндыкай (мал. 2).




**Малюнак 2**

У вызначанай такім чынам сістэме каардынат Ваналанд адпавядае тэрыторыі Керчанскага паўвострава разам з Выспай. Асаблівасці населенасці дадзенай тэрыторыі, пачынаючы з VII ст. да н. э., досыць добра асветлены ў крыніцах, бо менавіта ў гэты перыяд пачалася Вялікая грэчаская каланізацыя ўвогуле і грэчаская каланізацыя Паўночнага Прычарнамор’я ў прыватнасці. Так, першыя грэкі з’явіліся на Керчанскай паўвыспе ўжо ў канцы VII ст., прычым усе яны, паходзячы з Малой Азіі, былі іанійцамі з Мілета[3]. Менавіта іанійцы на першым этапе каланізацыі заснавалі Пантыкапей[4] (каля 600 г. да н. э. [42, с. 161]), Феадосію[5] (575–500 гг. да н. э. [42, с. 162]), Цірытаку[6] (каля 550 г. да н. э. [42, с. 162]), Німфей[7] (каля 600 г. да н. э. [42, с. 161]), Мірмекій[1] (600–575 гг. да н. э.

[1] <Краіна на ўсход ад Танаквісла ў Азіі завецца Асаланд ці Асахайм, і галоўны горад на гэтай зямлі быў названы Асгардам>.

[2] Выспа, утвораная двума рэчышчамі Баспора Кімерыйскага, відавочна, не мела адмысловай назвы. Па меншай меры ў грэчаскіх крыніцах таго часу асаблівасці ўжывання грэчаскага імя намінальнага *νῆσος* ‘выспа’ ў дачыненні да заходняй часткі сучаснай Таманскай паўвыспы дазваляюць інтэрпрэтаваць яго і як імя ўласнае *Νῆσος* ‘Выспа’. Таму тут і далей у дачыненні да гэтага локуса будзе ўжывацца ўмоўны інсулонім Выспа.

[3] Мілет (грэч. *Μίλητος*) — старажытны грэчаскі горад у Малой Азіі, заселены грэкамі яшчэ ў перыяд ранняй іанійскай каланізацыі ў XI–X стст. да н.э. (37°30'41"N, 27°16'31"E).

[4] Пантыкапей (грэч. *Παντικάπαιον*) — грэчаская калонія на месцы сучаснага г. Керч (45°20'19"N, 36°28'05"E).

[5] Феадосія (грэч. *Θεοδοσία*) — зараз г. Феадосія (45°02'56"N, 35°22'45"E).

[6] Цірытака (грэч. *Τυριτάκη*) — антычнае гарадзішча ў 11 км на поўдзень ад Пантыкапея (45°21'03"N, 36°28'07"E).

[7] Німфей (грэч. *Νυμφαῖον*) — грэчаская калонія ў 17 км на поўдзень ад Пантыкапея (45°14'12"N, 36°25'03"E).

[42, с. 161]). На Выспе, у сваю чаргу, таксама мілецянамі былі заснаваныя Германаса[2] (каля 600–575 гг. да н. э. [42, с. 161]) і Кепы[3] (каля 575–550 гг. да н. э. [42, с. 160]), а выхадцамі з іанійскага Тэаса[4] — Фанагорыя (каля 550–500 гг. да н. э. [42, с. 162]). У выніку можна канстатаваць, што ўвесь арэал, прыналежны ў адпаведнасці са скандынаўскім міфалагічным дыскурсам супольнасці Ванаў, на самой справе ў I тыс. да н. э. быў каланізаваны іанійскімі грэкамі.

***

Згаданая акалічнасць дае падставы дапусціць, што менавіта іанійскія грэкі, аселыя ў раёне Баспора Кімерыйскага, якраз і з'ўляліся супольнасцю, вядомай у нардычнай традыцыі як Ваны. Іанійцы (грэч. *Ἴωνες* альбо *Ἰάονες*), што лічацца абавязанымі сваім эндаэтнонімам Іону (*Ἴων*), сыну Ксуфа і ўнуку Эліна, з'ўляліся адным з чатырох грэчаскіх субэтнасаў і першапачаткова насялялі Ахаю, а пасля дарыйскага нашэсця — Атыку і частку выспы Эўбея. Уласна яны, іанійцы, сталі авангардам грэчаскага каланізацыйнага руху, калі прыкладна ў X ст. да н. э. здолелі трывала замацавацца на вялікай частцы заходняга ўзбярэжжа Малой Азіі, узяўшы пад свой кантроль значную долю анаталійскага рынка гандлю металамі. У гэтым рэсурсе вялікі недахоп мелі Асірыя і Нававалілонскае царства, і менавіта семіцкія купцы сталі асноўнымі контрагентамі іанійцаў у дадзенай сферы камерцыйных інтарэсаў. Адным з адлюстраванняў такіх культурных кантактаў з'явіліся згадкі пра грэкаў у Бібліі, дзе эпонім іанійцаў — Іон, сын Ксуфа, — трансфармаваўся ў варыянт ***Яван, сын Яфетаў*** (Быццё 10:2,4) — *יָוָן* (*Yāvān*). Адначасова гэты эпонім — *Yāvān* — пачаў ужывацца таксама ў якасці экзаэтноніма, якім семіты пазначалі спачатку малаазійскіх іанійцаў (Ісая 66:19; Езэкііль 27:13), а потым і ўвогуле ўсіх грэкаў[5]. Прычым ужыванне такой формы экзаэтноніма зафіксавана не толькі ў сакральных тэкстах, але і, напрыклад, у гаспадарчай дакументацыі аб экспарце жалеза і медзі ў Вавілон з грэчаскага ўзбярэжжа Малой Азіі якраз у сярэдзіне VI ст. (551–550 гг. да н. э.) [43, с. 260–261], калі іанійцы актыўна каланізавалі раён Баспора Кімерыйскага.

[1] Мірмекій (грэч. *Μυρμήκιον*) — грэчаская калонія ў 4 км на поўнач ад Пантыкапея (45°14'12"N, 36°25'03"E).

[2] Германаса (грэч. *Ἑρμώνασσα*) — грэчаская калонія на ўзбярэжжы сучаснага Таманскага паўвострава на месцы сучаснай ст. Тамань Краснадарскага краю (45°13'00"N, 36°43'00"E).

[3] Кепы (грэч. *Κῆποι*) — грэчаская калонія на ўзбярэжжы сучаснага Таманскага паўвострава (45°18'11"N, 36°59'35"E).

[4] Тэас (грэч. *ἡ Τέος*) — старажытны іанійскі горад на заходнім узбярэжжы Малой Азіі (38°10'38"N, 26°47'06"E).

[5] Паказальна, што такая ж форма імя захоўваецца і ў Вульгаце (*Iavan*), і ў сучасных нацыянальных перакладах Бібліі, але ў Сэптуагінце выкарыстоўваецца адметная форма Іанан (*Ιωναν*), вельмі блізкая да першаўзору.

Між тым падобным у фанетычных адносінах чынам іанійцаў звалі не толькі семіты, але таксама і індаарыі[1]. Так, санскрыцкае यवन (*yavana*) мае семантыку 'іаніец, грэк' (англ. *Ionian*, *Greek*) [45, с. 848], і падобным чынам у Індыі называлі тых грэкаў, што патрапілі ў Індастан у IV ст. да н. э. з войскам Аляксандра Македонскага ці нават раней. Таму "Махабхарата" пералічвае ***яванаў*** у шэрагу іншаземцаў-варвараў, "<…> ***(жыхароў) царстваў, што ляжаць на захадзе, побач з акіянам*** <…>", прычым разам з ***яванамі*** тут аднначасова згадваюцца і "***жыхары Сіндху***" (*Mahabh*. III. 48. 15–22) [46, с. 115], у якіх пры наяўнасці пэўнай інтэнцыі можна пазнаць сіндаў — насельнікаў Сіндыкі з усходняга берага Танаквісла. Зараз цяжка сказаць, наколькі карэктнай будзе такая аналогія, як цяжка зараз вызначыць і адну з дзвюх магчымых крыніц моўнага ўплыву на эндаэтнонім іанійцаў, хоць абедзве яны досыць праўдападобныя. Разам з тым вельмі верагодным падаецца тое, што скандынаўскі міфонім Ваны (*Vanir*) з'ўляецца вынікам скажэння экзаэтноніма "***яваны***" (יָוָן/यवन), пад якім у I тыс. да н. э. іанійскія грэкі былі вядомыя сярод сваіх суседзяў на берагах Баспора Кімерыйскага.

Міфонім *Vanir* звычайна этымалагізуецца ад скандынаўскага 'сябар', а таксама ад вельмі спецыфічнага семантычнага поля, звязанага з топікай цялеснага кахання ('асалода, пажаднасць') [7, с. 311; 47, с. 27]. Грунтуецца хутчэй за ўсё такая традыцыя на этымалогіі, прапанаванай у свой час Юліусам Пакорным для этноніма адрыятычных венетаў, які нібыта паходзіць ад індаеўрапейскага *u̯en-*, *u̯enə-* 'імкнуцца' (ням. *streben*), адкуль 'жаданне, каханне, задавальненне' (ням. *wünschen*, *lieben*, *befriedigt*) [48, с. 1146–1147]. Натуральна, што Ваны не мелі нічога агульнага з венетамі[2], але падобная этымалогія ў вачах даследчыкаў скандынаўскай архаікі вельмі добра стасавалася з традыцыйным статусам гэтай групы персанажаў скандынаўскага пантэона як "<…> ***вузкай групы багоў, спецыфічна звязанай з аграрнымі культамі*** <…>", што персаніфікавалі нават пэўную "<…> ***«ванічную» міфалогію*** <…>" адпаведнага зместу [49, с. 275–276].

Тут перш за ўсё трэба салідарызавацца з меркаваннем Аларыка Хола, які слушна заўважае, што выснова пра трывалую сувязь Ванаў з "***фертыльнасцю***" (*Fruchtbarkeit*) з'ўляецца толькі вынікам "<…> ***запалу вучоных XIX і пачатку XX стст., усюды знаходзіць «культы ўрадлівасці»*** <…>", і такія падыходы трэба перагледзець [50, с. 36]. Якраз рудыментам падобных уяўленняў, уласцівых перш за ўсё класічнай міфалагічнай школе, з'ўляецца і пасаж

[1] Гэта не тычыцца старажытнаіранскіх моў, бо ў старажытнаперсідскай мове этнонім 'іаніец' (англ. *Ionian*) мае выгляд *Yauna* [44, с. 204].

[2] У дадзеным выпадку сярод праціўнікаў еўгемерызму назіраецца сімптаматычная хісткасць метадалагічных прынцыпаў, бо самім фактам прызнання актуальнасці падобнай этымалогіі яны гатовыя атаясніць групу персанажаў скандынаўскага пантэона з рэальнай этнічнай групай, лакалізаванай антычнымі крыніцамі спачатку ў Малой Азіі, а потым на ўзбярэжжы Адрыятычнага мора.

Елеазара Меляцінскага пра “*«ванічную» міфалогію*” як пра “*аграрную культавую міфалогію*”, для якой характэрны наступныя рысы: інцэстуальныя шлюбы паміж братамі і сёстрамі; валоданне магіяй і вяшчунскімі здольнасцямі; “*рытуальная міралюбнасць*”, што забяспечвае ўраджай і багацце [49, с. 275–276].

Як гэта ні дзіўна, але ўсе згаданыя рысы, што вызначалі сутнасць “*«ванічнай» міфалогіі*” ў вачах паслядоўнікаў класічнай міфалагічнай школы, у пэўнай ступені былі прыналежныя і рэальным “*яванам*”. Між тым гэтая прыналежнасць, прынамсі, не мела аніякага дачынення да рытуальнага заахвочвання фертыльнасці, бо абумоўлівалася данінай пэўным традыцыям, і ў найбольшай ступені — асаблівасцямі каланізацыйных стратэгій іанійскіх грэкаў на берагах Баспора Кімерыйскага.

Сярод такіх традыцый і стратэгій у першую чаргу трэба згадаць інцэст. Гэты матыў актуалізуецца ў наратыве Сноры Стурлусана пры апісанні матрыманіяльных нораваў Ванаў: “*Njǫrð ok Frey setti Óðinn blótgoða ok váru þeir díar með Ásum. Dóttir Njarðar var Freyja; hon blótgyðja; hon kendi fyrst með Ásum seið, sem Vǫnum var títt. Þá er Njǫrðr var með Vǫnum, þá hafði hann átta systur sína, því at þat váru þar lǫg; váru born Freyr ok Freyja, en þat var bannat með Ásum at byggva svá náit at frændsemi*”[1] [2, с. 5–6]. Сапраўды, “*значная колькасць матываў, прысвечаная тэме максімальнай плоднасці* <…>, *якраз і вылучае інцэст як прычыну звышмернай урадлівасці*”, метафарай якой звычайна выступае з’яўленне новай культурнай расліны [51, с. 117]. Між тым у дадзеным выпадку Сноры Стурлусан проста канстатуе факт практыкаванага Ванамі інцэстуальнага шлюбу паміж братамі і сёстрамі, і такая канстатацыя, не ствараючы ніякага драматычнага мікрасюжэта, звязанага з актуалізацыяй нейкай новай культавай якасці, мае, хутчэй, рысы этнаграфічнай замалёўкі. Менавіта такой замалёўкай яна, верагодней за ўсё, першапачаткова і была, бо антычныя грэкі да шлюбу брата з сястрой ставіліся памяркоўна, калі тыя былі народжаны рознымі маткамі, больш за тое, у старых кансерватыўных сем’ях нават шлюб паміж народжанымі адной маці братам і сястрой “<…> *не быў справай нечуванай* <…>” [52, с. 418]. Ва ўмовах каланізацыйнай экспедыцыі гэтыя спецыфічныя матрыманіяльныя практыкі маглі набыць большую актуальнасць, бо ў падобных прадпрыемствах за вельмі невялікім выключэннем (якое складалі, напрыклад, жрыцы) прымалі ўдзел, як правіла, адны мужчыны, што разлічвалі ажаніцца з абарыгенкамі [42, с. 147–148]. У тых жа выпадках, калі характар стасункаў з мясцовым насельніцтвам не спрыяў падобнаму развіццю падзей, узрастала каштоўнасць абмежаванага кола ўласных жанчын.

[1] <Ньёрда і Фрэйра зрабіў Одзін жрацамі, і яны былі дыямі ў Асаў. Дачкой Ньёрда была Фрэя; яна была жрыцаю; яна першая ўжыла паміж Асамі чарадзейства, як гэта было прынята ў Ванаў. Калі Ньёрд быў у Ванаў, тады ён быў жанаты са сваёй сястрой, бо там гэта так рабілася; у іх нарадзіліся Фрэйр і Фрэя, але ў Асаў быў забаронены шлюб з такімі блізкімі сваякамі>.

У такіх варунках той “скарб”, які ўяўляла сабой жаночае цела з яго адносна абмежаваным фертыльным патэнцыялам, каланісты імкнуліся па магчымасці не выпускаць з сям’і, у выніку чаго маглі ўзнікаць сітуацыі інцэсту.

Чарадзейства і вяшчунскія здольнасці таксама належалі да рысаў, якімі надзяляліся Ваны. Менавіта такім чынам мясцовыя варвары маркіравалі цывілізацыйную мабільнасць, варыятыўнасць паводзінных стратэгій, а таксама адметнасць культавых практык, што былі прыналежныя іанійскім грэкам. Уласна таму першай чарадзейкай сярод Асаў лічылася жрыца Фрэя з роду Ванаў [2, с. 5], але больш паказальным у гэтых адносінах з’яўляецца адлюстраваны ў “*Sæmundar Edda*” эпізод, звязаны з вядзьмаркай Гульвейг. Яна была пасланая Ванамі да Асаў, якія некалькі разоў беспаспяхова спрабавалі забіць вядзьмарку, што, у сваю чаргу, паслужыла падставай для вайны паміж дзвюма супольнасцямі (*Vol.* 26): “*Þat man hon folkvíg // fyrst í heimi, // er Gullveigu // geirum studdu, // ok* ***í hǫllu*** *Hárs // hana brendu; // þrysvar brendu // þrysvar borna, // opt ósialdan –: // þó hón enn lifir*”[1] [53, с. 7].

Само імя вядзьмаркі — *Gullveig* — уяўляе сабой кампазіт з дзвюх старажытнаісландскіх лексем, першая з якіх *gull* ‘золата’ (англ. *gold*) [19, с. 175], а другая — *veig* — мае два варыянты перакладу: ‘моцны напой’ (англ. *strong beverage*), а таксама ‘сутнасць, сіла, моц’ (англ. *pith, strength*) [19, с. 479]. Звычайна пры інтэрпрэтацыі гэтага міфоніма перавага аддаецца другому варыянту, што ў выніку дае досыць прымальную семантыку ‘моц золата’, але ў дадзеным выпадку больш дакладным, як падаецца, выглядае варыянт, нечым падобны на ‘п’янае золата’. Алкаголь і прадметы раскошы, прызначаныя для племяннoй эліты, звычайна з’яўляліся той універсальнай спакусаю, якую кожны цывілізаваны соцыум імкнуўся прапанаваць варварскай супольнасці пры кантакце дзеля атрымання большай ступені палітычнага і эканамічнага кантролю над ёю. Натуральна, што такі таварны паток не мог быць аднабаковым, і платай за яго звычайна былі рабы, бо менавіта рабы складалі адзіны заўсёды запатрабаваны таварны артыкул, які магла няспынна прадукаваць прымітыўная эканоміка мілітарнага грамадства. Звычайна колькасць рабоў для гандлю папаўнялася за кошт палонных, але вельмі значная іх частка з’яўлялася таксама вынікам закабалення супляменнікаў. Гэта прыводзіла да непазбежнага расслаення раней адносна маналітнага варварскага грамадства, выхаванага на ідэалах вайсковай дэмакратыі, што не магло не спараджаць адпаведнай рэакцыі прыхільнікаў старых вайсковых цнот, праявай якой, відавочна, і стала вайна паміж Ванамі і Асамі.

Апошняй рысай, характэрнай для “*«ванічнай» міфалогіі*”, з’яўлялася “*рытуальная міралюбнасць*”, што забяспечвала ўраджай і багацце. Сам факт таго, што каланізацыю Баспора Кімерыйскага ажыццяўлялі менавіта іанійскія

[1] <Памятае вайну яна // першую ў свеце, // калі Гульвейг // працялі коп’ямі // і ў зале Хор // спалілі яе; // тройчы спалілі, // і тройчы нарадзілася, // але, насуперак усяму, // яна дагэтуль жывая>.

грэкі (“*яваны*”), тлумачыць пацыфізм, характэрны для Ванаў. Так, Вялікая грэчаская каланізацыя прадугледжвала дзве асноўныя міграцыйныя стратэгіі, якія ўмоўна вылучаюцца яе даследчыкамі [54, с. 210]. Першая, вядомая як “дарыйская” мадэль паводзінаў, вызначалася агрэсіўнасцю, жорсткасцю і схільнасцю да сілавога вырашэння сацыяльных супярэчнасцей, калі пры заснаванні сваіх калоній дарыйцы імкнуліся звесці абарыгенаў да статусу прыгонных. Іанійцы, у сваю чаргу, сярод іншых грэкаў ніколі не вылучаліся асаблівым вайсковым імпэтам, і, верагодна, менавіта таму яны прытрымліваліся ўласнай, “іанійскай”, мадэлі, якая характарызавалася большай гнуткасцю, варыятыўнасцю, а таксама гатоўнасцю да кампрамісаў і супрацоўніцтва з тубыльцамі. Уласна, гэтыя рысы міграцыйнай стратэгіі рэальных “*яванаў*” і абумовілі ўяўленне пра “*рытуальную міралюбнасць*” легендарных Ванаў, скіраваную на забеспячэнне ўраджаю.

Забеспячэнне ўраджаю, між тым, сапраўды з’яўлялася адной з важнейшых задач калоній Мілета на Баспоры Кімерыйскім, бо “<…> *асноўная частка грэчаскіх калоній і асноўная частка каланістаў кармілася за кошт земляробства, а таму большасць людзей, што далучаліся да каланіяльнай экспедыцыі, натхняліся спадзяваннем на атрыманне ўчастка сельскагаспадарчай зямлі, якой не было на радзіме. Таму* <…> *грэчаская каланізацыя насіла ў асноўным аграрны характар* <…>” [42, с. 158]. Уласна малаазійская спецыфіка сітуацыі заключалася таксама і ў тым, што ў 610–605 гг. да н. э. Мілет змагаўся з лідзійскім царом Аліятам (619–560 гг. да н. э.), які абраў для сябе тактыку “выпаленай зямлі”, скіраваную на планамернае знішчэнне мілецкай хоры (Hdt. I. 17): “*ἐπολέμησε Μιλησίοισι, παραδεξάμενος τὸν πόλεμον παρὰ τοῦ πατρός. ἐπελαύνων γὰρ ἐπολιόρκεε τὴν Μίλητον τρόπῳ τοιῷδε: ὅκως μὲν εἴη ἐν τῇ γῇ καρπὸς ἁδρός, τηνικαῦτα ἐσέβαλλε τὴν στρατιήν: ἐστρατεύετο δὲ ὑπὸ συρίγγων τε καὶ πηκτίδων καὶ αὐλοῦ γυναικηίου τε καὶ ἀνδρηίου. ὡς δὲ ἐς τὴν Μιλησίην ἀπίκοιτο, οἰκήματα μὲν τὰ ἐπὶ τῶν ἀγρῶν οὔτε κατέβαλλε οὔτε ἐνεπίμπρη οὔτε θύρας ἀπέσπα, ἔα δὲ κατὰ χώρην ἑστάναι: ὁ δὲ τὰ τε δένδρεα καὶ τὸν καρπὸν τὸν ἐν τῇ γῇ ὅκως διαφθείρειε, ἀπαλλάσσετο ὀπίσω*”[1] [55, с. 20]. У выніку дэградацыі мілецкай хоры многія мясцовыя земляробы пазбавіліся сродкаў да існавання, таму міграцыя была для іх прымальным выйсцем са складанай жыццёвай сітуацыі. Метраполія, у сваю чаргу, мела магчымасць нівеліраваць непазбежныя сацыяльныя катаклізмы[2], а таксама набыць аддаленую хору, якая

[1] <Ён працягнуў вайну супраць мілетцаў, распачатую яго бацькам. Узяўшы ў аблогу Мілет, ён ваяваў наступным чынам: ён пасылаў свае войска ў час паспявання ўраджаю, якое ішло пад гукі труб, арфаў, а таксама басовых і высокіх флейт; і кожны раз, калі ён прыходзіў на землі Мілета, то не разбураў і не паліў дамоў, не выбіваў дзверы, але пакідаў усё цэлым: ён знішчаў дрэвы і пасевы на зямлі, а пасля вяртаўся туды, адкуль прыйшоў>.

[2] Да прычын “*выключнай каланізацыйнай актыўнасці*” Мілета ў Паўночным Прычарнамор’і Віктар Гайдукевіч дадае таксама ўнутраную палітычную нестабільнасць (“*жорсткую барацьбу класаў*”), выкліканую сацыяльнай няроўнасцю, што цягнулася з пачатку VI ст. да н. э. на працягу жыцця двух пакаленняў [56, с. 24–25].

пры належным экспартным патэнцыяле (а ў далейшым такі патэнцыял быў досыць значным [57, с. 6]) магла забяспечыць Мілет хлебам.

***

На ўсход ад Танаквісла ляжала зямля, вядомая як Сіндыка, і менавіта гэта дае падставы атаясніць яе з Асаландам, а ўласна сіндаў ці, магчыма, пэўную іх частку — з Асамі. Негледзячы на тое, што гэты народ досыць часта згадваецца ў антычных крыніцах, пэўных звестак пра яго захавалася няшмат. Так, этнічнае паходжанне і моўная прыналежнасць сіндаў дагэтуль не высветлены, і тыя ўрыўкавыя звесткі, што існуюць на гэты конт, няшмат чаго даюць для разумення сутнасці праблемы. Страбон (I ст. да н. э. – I ст. н. э.), напрыклад, далучаў іх да ліку меотаў: “*τῶν Μαιωτῶν δ' εἰσὶν αὐτοί τε οἱ Σινδοὶ* <…>”[1] [58, с. 695]. Найбольш раннія аўтары, наадварот, адасаблялі гэтыя этнічныя супольнасці, як рабіў гэта Скілак Карыяндскі (VI ст. да н. э.): “*Μετὰ δὲ Μαιώτας Σίνδοι ἔθνος* <…>”[2] (*Scyl.*, 72) [59, с. 59]. Хутчэй за ўсё, больш рацыі тут мелі апошнія, бо сінды і меоты належалі да вельмі непадобных краніялагічных тыпаў: у адрозненне ад сваіх суседзяў, сінды вызначаліся невысокім і шырокім тварам з шырокім носам[3] [61, с. 292]. Разам з тым адрозненне паміж сіндамі і меотамі не ў большай ступені, чым падабенства паміж імі, дае падставы для нейкіх больш пэўных высноў, бо паходжанне меотаў таксама не высветлена, як невядома і іх мова.

Меотамі звычайна называюць сукупнасць плямёнаў, што ў I тыс. да н. э. пражывалі на ўсходнім і паўднёва-ўсходнім узбярэжжах Меатыды. Існавала досыць экзатычная версія адносна таго, што іх этнонім утвораны ад назвы Меатыды з адыгскай этымалогіяй, дзе “<…> *meі — смурод, і jаʼе — балота, твань, лужа* <…> *такім Азоўскае мора, што зарасло па берагах чаратом, са стаялай вадой, магло сапраўды ў параўнанні з Чорным морам уяўляцца мясцовым народам*” [62, с. 77–78]. Такая этымалогія даўно страціла сваю актуальнасць, але тым не менш і зараз не адмаўляецца магчымасць таго, што меоты былі каўказскімі абарыгенамі пад іранскім панаваннем, хоць, паводле іншага погляду, яны, падобна да фракійцаў, нібыта мелі кімерыйскі радавод [63, с. 572], у чым, магчыма, маецца рацыянальнае зерне. Зрэшты, апошняя атрыбуцыя таксама вызначаецца адноснай эфемернасцю, бо паходжанне кімерыйцаў дакладна не акрэслена.

Адметную пазіцыю ў пытанні этнагенезу меотаў займаў Алег Трубачоў, які лічыў іх (разам з сіндамі) рэліктавай групай індаарыяў, якія размаўлялі на “*прыпантыйскім індаарыйскім дыялекце*”, які хоць і не адпавядае “*класічнаму*

[1] <Да ліку меотаў можна далучыць саміх сіндаў <…>>.

[2] <Далей за меотамі народ сіндаў <…>>.

[3] Сюды, відавочна, трэба таксама дадаць і доўгі волас, бо менавіта так малюе тыповага сінда Фенікс Калафонскі (III ст. да н. э.) (*Athen.* XII. 40): “<…> *балотны сінд з даўгімі валасамі* <…>” (“<…> *λιμνῶν Ἰνδὸς κομήτης* <…>”) [60, с. 170].

*індыйскаму альбо санскрыту*”, але тым не менш “<...> *складваецца ў старажытную, але вельмі жывую карціну народнага індыйскага дыялекту — пракрыту*” [64 с. 36]. На карысць гэтай гіпотэзы сведчыць і адзінае меатыйскае ўласнае імя, якое данесла да нас гісторыя.

Так, Паліен (II ст. н. э.) у “*Στρατηγήματα*” згадвае “*меатыйку Тыргатаа*” (“*Τιργαταώ Μαιῶτις*”), былую жонку “*сіндскага цара Гекатэя*” (“*Ἑκαταίῳ βασιλεῖ Σίνδων*”), якая дзесьці каля 388 г. да н. э. дзеля помсты ўзняла мяцеж сваіх супляменнікаў супраць Баспора і Сіндыкі (*Polyaen. Strateg.* VIII. 55) [65, с. 415–416]. Падобнае ж імя — *Tirgutawiya* — было зафіксавана ў паўночнасірыйскім горадзе Алалах[1] і датавана сярэдзінай II тыс. да н. э. [66, с. 185]. Менавіта ў гэты час (каля 1525 г. да н. э.), з заняпадам царства Ямхад, Алалах патрапіў пад пратэктарат Мітані. Гэтая дзяржава, у сваю чаргу, мела хурыцкае насельніцтва, але мітанійская арыстакратыя паводле паходжання з’яўлялася індаарыйскай, і яе мова — мітанійская арыйская мова — “<...> *была вельмі блізкай да тых моў, што вядомыя па індыйскіх мовах* <...>”, і была “<...> *бліжэй за ўсё да санскрыту, чым да любога з іранскіх дыялектаў* <...>”. У сярэдзіне II тыс. да н. э. у Мітані яна ўжо шырока не ўжывалася, але выкарыстоўвалася для абслугоўвання мітанійскага дзяржаўнага сакрума: арыстакратычны анамастыкон (у тым ліку царскі), культавая сфера, конегадоўля. Падобна на тое, што гэтыя мітанійскія “<...> *уладары былі індыйцамі, але тымі індыйцамі, якія яшчэ не дайшлі да Індыі* <...>”, пры гэтым “<...> *тэрыторыя, на якой калісьці існавала гэтая індаіранская супольнасць, размяшчалася дзесьці на поўнач ад Каўказскіх гор* <...>” [67, с. 18–20].

Маркерам гэтай зыходнай тэрыторыі ў нізоўях Дона і Кубані якраз і з’яўляецца адносна позні меоцкі антрапонім *Τιργαταώ*, роднасны больш старажытнаму мітанійскаму *Tirgutawiya*, і на іх неаспрэчную сувязь неаднаразова звяртаў увагу Алег Трубачоў [64, с. 36], які менавіта меотаў лічыў рэліктамі таго архаічнага протаіндыйскага насельніцтва, вырушыўшага калісьці ў далёкую выправу на поўдзень. З гэтым, відавочна, трэба пагадзіцца, бо ў такім кантэксце знаходзіць таксама вытлумачэнне індаарыйская форма экзаэтноніма “*яваны*”, якую ў дачыненні да іанійскіх грэкаў спарадзіла пракрыцкая моўная стыхія на берагах Баспора Кімерыйскага.

Між тым Асамі, хутчэй за ўсё, былі не меоты, а сінды[2], якія, верагодна, у той ці іншай форме запазычылі ў сваіх суседзяў дадзены індаарыйскі экзаэтнонім. Прычым з’яўленне на азіяцкім баку Баспора Кімерыйскага спецыфічнай групы насельніцтва, што лёгка атаясняецца з сіндамі, досыць дакладна акрэсліваецца аб’ектыўнымі археалагічнымі данымі. Так, пахавальныя помнікі Заходняга Закубання яшчэ VIII–VII стст. да н. э. вызначаюцца

[1] Алалах — старажытны хурыта-сяміцкі горад, што існаваў у складзе розных дзяржаўных утварэнняў з XX па XII ст. да н. э. (36°14'16"N, 36°23'05"E).

[2] Дарэчы, Алег Трубачоў не размяжоўваў між сабой гэтыя супольнасці.

матэрыяльнай культурай, якая "<...> *ў цэлым мае падабенства з протамеоцкімі і раннемеоцкімі старажытнасцямі, хоць і нясе ў сабе некаторы «каўказска-прычарнаморскі» адбітак*". Неўзабаве гэтая сітуацыя карэнным чынам мяняецца, бо дзесьці ў канцы VII ст. да н. э. на тэрыторыі будучай Сіндыкі адбываецца радыкальная змена насельніцтва, калі на змену ранейшым протамеоцкім пахаванням прыходзяць "*помнікі зусім іншага абліччa*": курганныя пахаванні ў вялікіх ямах, часам са складанымі драўлянымі канструкцыямі. Інвентар гэтых помнікаў (Холмскі[1], Цыпліеўскі кут[2], Цокур-ліман[3], Крымская[4], Фадзеева[5], Сямібратнія курганы[6], Саўк-Дарэ[7], Шэсхарыс[8], Цэмдаліна[9]), які "<...> *у цэлым мае яскрава выяўленае вайсковае абліччa* <...>", вызначаецца характэрнымі дэталямі абарончага даспеху і конскіх цугляў, вялікімі калчаннымі наборамі, а таксама бронзавым кляпаным посудам, што дазваляе далучыць яго да "*раннескіфскай культуры*". З прыходам новага насельніцтва, якое ўяўляла сабой гомасацыяльную мілітарную групу, аўтахтоны левабярэжжа Ніжняй Кубані — меоты — былі цалкам выцеснены альбо знішчаны, і толькі каля сучаснага Новарасійска "<...> *абодва этнічныя масівы, скіфоідны і абарыгенны, суіснавалі*". Вынікам такога кроскультурнага сінтэзу становіцца пэўная трансфармацыя пахавальнага абраду, калі з II паловы VI ст. да н. э. на гэтай тэрыторыі актуалізуецца і паступова пашыраецца "<...> *практыка збудавання каменнай скрыні, замкнёнай у акруглую каменную абкладку ў выглядзе кольца ці вежачкі*", дзе нябожчыкі ляжалі альбо выцягнута на спіне, альбо радзей скурчана, з пераважна ўсходняй арыенціроўкай [68, с. 73–74].

Абавязкова неабходна падкрэсліць пры гэтым, што новае насельніцтва было "*скіфоідным*", але гэта ні ў якім разе не азначае, што яно было "скіфскім". Пад "*скіфоіднасцю*" тут разумеюцца зусім не нейкія спецыфічныя

[1] Холмскі — археалагічны аб'ект каля станіцы Холмская (рус. *Холмская*) Абінскага раёна Краснадарскага краю (44°51'00"N, 38°23'00"E).

[2] Цыпліеўскі кут (рус. *Циплиевский кут*) — урочышча з курганнай групай, размешчанае ў 3,5 км на паўднёвы ўсход ад хутара Хабль (рус. *Хабль*) у Абінскім раёне Краснадарскага краю (44°55'45"N, 38°18'42"E).

[3] Цокур-ліман (рус. *Цокур-лиман*) — ліман у цэнтральнай частцы Таманскага паўвострава (45°10'30"N, 36°56'30"E).

[4] Археалагічны помнік у раёне ст. Крымская (рус. *Крымская*) Паўночна-Каўказскай чыгункі (44°54'45"N, 38°00'14"E).

[5] Фадзеева (рус. *Фадеево*) — сяло ў Крымскім раёне Краснадарскага краю (45°03'58"N, 37°33'16"E).

[6] Могільнік на тэрыторыі археалагічнага помніка Сямібратняе гарадзішча (рус. *Семибратнее городище*) у 12 км на захад ад станіцы Варэнікоўскай (рус. *Варениковская*) — (45°07'00"N, 37°39'00"E).

[7] Саўк-Дарэ (рус. *Саук-Дере*) — пасёлак у Крымскім раёне Краснадарскага краю (44°54'12"N, 37°53'18"E).

[8] Шэсхарыс (рус. *Шесхарис*) — тэрыторыя Новарасійскага марскога порта (44°43'32"N, 37°47'20"E).

[9] Цэмдаліна (рус. *Цемдолина*) — сяло ў адміністратыўных межах г. Новарасійска (44°45'18"N, 37°43'34"E).

этнавызначальныя рысы, а набор досыць універсальных для VII ст. да н. э. матэрыяльных маркераў, звязаных перш за ўсё з канструктыўнымі асаблівасцямі ўзбраення і паходнага рыштунку стэпавай мілітарыі. Гэты набор быў характэрны для ўсіх “<…> *плямёнаў качавых коннікаў* <…>” той эпохі [69, с. 253], якімі і былі ўласна скіфы, кімерыйцы, а таксама, верагодна, сінды. У многім тут мае рацыю Уладзімір Гаранчароўскі, калі лічыць, што “<…> *сіндаў трэба разглядаць як адносна невялікую групу азіяцкіх качэўнікаў, адрозных ад скіфаў, але зведаўшых на пэўным этапе іх моцны палітычны і культурны ўплыў*”[1] [70, с. 233]. У асноўным гэта так, але больш дакладнай тут бачыцца наступная характарыстыка: сінды — вынік узаемадзеяння індаарыйскага меотскага субстрату са “скіфоідным” суперстратам, які быў прадстаўлены ваяўнічымі качавымі вершнікамі няпэўнага паходжання, што ў свой час зведалі досыць моцны іранскі культурны ўплыў.

Так, сінды перш за ўсё былі вершнікамі, і матэрыяльны дабрабыт Сіндыкі грунтаваўся на “<…> *адгоннай жывёлагадоўлі, заснаванай на сезонных перагонах жывёлы на адносна кароткія адлегласці па нейкіх замкнёных маршрутах*”, пра што сведчаць “<…> *парэшткі часовых жывёлагадоўчых стаянак тыпу кошаў VI–IV стст. да н. э.*” [70, с. 227]. Гэтым сінды прынцыпова адрозніваліся і ад “яванаў”, і ад меотаў, эканоміка якіх сілкавалася пераважна земляробствам. У такіх варунках натуральна, што ў гэтых намадаў доўга захоўваліся “<…> *элементы родаплемяннной структуры ўлады, калі кіраўніцтва племенем ажыццяўлялася ад імя яго членаў, а цар выступае як «першы сярод роўных»*”, а таксама “<…> *правадыр войска як сбору ўзброеных вольных людзей* <…>” [70, с. 249]. Такі раўнапраўны саюз вольных ратнікаў і цара-правадыра, характэрны для вайсковай дэмакратыі, непазбежна мусіў дэградзіраваць пры сутыкненні з больш цывілізаваным грамадствам, што было прадстаўлена ў дадзеным выпадку “яванамі” і адносна развітай сістэмай таварна-грашовых стасункаў. Цывілізацыя спакушала варварскую вярхушку бляскам і раскошай, але прымітыўная эканоміка магла прапанаваць у адказ толькі адзін рэсурс: закабаленне супляменнікаў, што не магло не спараджаць сур’ёзнай напружанасці. У выніку на мясцовым сацыяльным ландшафце пастулова пачынаюць вылучацца значныя пахавальныя комплексы сіндскай арыстакратыі, якія ўтрымлівалі ў сабе багаты інвентар, прадстаўлены зброяй, упрыгожаннямі ў звярыным стылі, іншай прадукцыяй прэстыжнага кантэксту, выробленай у грэчаскіх майстэрнях, і гэтыя “<…> *комплексы ў поўнай меры адлюстроўваюць працэс усё большай сацыяльнай дыферэнцыяцыі сіндскага грамадства ў ходзе развіцця грэка-варварскіх стасункаў на ўсходнім памежжы Баспорскай дзяржавы, што завяршылася ўключэннем Сіндыкі ў яе склад*”. Знакавай датай тут становіцца сярэдзіна V ст. да н. э., бо менавіта гэты час

[1] У дадзеным выпадку больш карэктна было б казаць не пра “*скіфскі*”, а пра індаіранскі ўплыў.

“<…> *стаў пераломным для сіндскіх правадыроў, значна пашырыўшы іх магчымасці ў сферы атрымання дароў і разнастайных каштоўнасцей*” [70, с. 245–246].

Так, каля 150 год спатрэбілася вядзьмарцы Гульвейг, каб канчаткова перамагчы суровых вершнікаў-пастухоў Асаланда зіхоткімі спакусамі “яванскай” цывілізацыі. Менавіта ў гэты прамежах часу, дзесьці з 600 па 450 гг. да н. э., відавочна адбылася згаданая Сноры Стурлусанам вайна паміж Ванамі і Асамі: “*Óðinn fór með her á hendr Vǫnum, en þeir urðu vel við ok vǫrðu land sitt, ok hǫfðu ýmsir sigr; herjuðu hvárir land annarra ok gerðu skaða. En er þat leiddisk hvárum tveggjum, lǫgðu þeir milli sín sættarstefnu ok gerðu frið ok seldusk gíslar* <…>”[1] [2, с. 5].

Тут, канешне, ніяк нельга пагадзіцца з класічнымі меркаваннямі адносна таго, што гэты вобраз адлюстраваў гіпатэтычны канфлікт паміж “мірнымі” еўрапейскімі земляробамі Бронзавага веку і ваяўнічымі прыхаднямі-індаеўарпейцамі, прыналежнымі да “культуры баявых сякер”, або канкурэнцыю паміж living рознымі функцыянальнымі групамі боствў унутры адной скандынаўскай міфалагічнай сістэмы [7, с. 53]. Наадварот, вайна паміж Ванамі і Асамі з’яўлялася, хутчэй за ўсё, рэальным, хоць і вельмі лакальным, вайсковым канфліктам, інспіраваным кансерватыўнай часткай сіндскага грамадства ў мэтах абмежавання цывілізацыйнага ўплыву “яванаў” на старыя цноты вайсковай дэмакратыі. Не мірны гандаль іншаземцаў з вузкім колам кампрадораў, а татальная рабаўнічая вайна са “справядлівым” падзелам “законнай” здабычы была яе ідэалам, і сінды / Асы імкнуліся спачатку рэалізаваць звыклую для сябе схему ў новых варунках.

Археалагічныя даныя сведчаць пра “<…> *пастаянную вайсковую пагрозу, якую адчувалі элінскія апойкіі* <…>” еўрапейскага ўзбярэжжа Баспора на пачатковым этапе свайго існавання. Рэшткі пажарышчаў на ранніх “яванскіх” паселішчах трывала стасуюцца з трыма асноўнымі датамі: сярэдзіна VI ст. да н. э., канец VI ст. да н. э., а таксама канец першай чвэрці V ст. да н. э. Апошняя дата пры гэтым звычайна звязваецца са скіфскай экспансіяй супраць грэкаў і сіндаў, другая — “<…> *з пярсідскімі вайсковымі выправамі да паўночнага ўзбярэжжа Понта* <…>” у межах кампаніі цара Дарыя супраць скіфаў, а вось першая звычайна ніяк не атрыбутуецца [71, с. 190–191]. Сляды пажарышча, храналагічна аднесеныя да сярэдзіны VI ст. да н. э., фіксуюцца толькі ў Пантыкапеі, галоўнай іанійскай апойкіі на Баспоры, і бліжэйшым да яго Мірмекіі, што сведчыць аб досыць абмежаваных маштабах інвазіі невядомага ворага на баспорскія калоніі іанійскіх грэкаў, але шкода, нанесеная абодвум гэтым паселішчам, з’яўляецца вельмі значнай, што, у

[1] <Одзін пайшоў вайной супраць Ванаў, але яны не былі заспетыя знянацку і абаранялі сваю зямлю, і дзеля вялікай перамогі яны змагаліся і наносілі адзін аднаму шкоду. Але калі ім гэта надакучыла, яны спынілі гэтую справу, і заключылі мір, і абмяняліся заложнікамі <…>>.

сваю чаргу, ілюструе сур'ёзнасць намераў агрэсара. Так, толькі таўшчыня гарэлага пласта пры раскопках археалагічных аб'ектаў перабольшвала 1 м, і, "*мяркуючы па ўсім, першы будаўнічы перыяд на дадзенай тэрыторыі верхняга плато Пантыкапейскай апойкіі завяршыўся моцным пажарам, які папярэдне адносіцца да сярэдзіны VI ст. да н. э.*" [71, с. 184]. Гэты "*моцны пажар*", відавочна, і з'яўляецца матэрыяльнай адзнакай легендарнай вайны паміж Ванамі і Асамі.

Перамогу ў гэтай вайне, як гэта ні дзіўна, святкавалі "міралюбныя" земляробы Ваны (Volusp. 28): "*Fleygði Óðinn // ok í fólk um skaut, // þat var enn fólkvíg // fyrst í heimi; // brotinn var borðvegr // borgar ása, // knáttu vanir vígská // vǫllu sporna*"[1] [53, с. 8]. Пры гэтым персаніфікавала канчатковае паражэнне ваяўнічых Асаў метафара зруйнавання Ванамі іх "борга" (*borgar ása*). У старажытнаісландскай мове лексема *borg* (*-ar, -ir*) мае семантыку 'невялікі пагорак; крэпасць, умацаванне, замак; умацаваны горад, горад' (англ. *a small domeshaped hill; stronghold, fortification, castle; fortified town, city*) [19, с. 63]. Гэтае семантычнае поле, натуральна, вельмі цесна пераплятаецца з адпаведным семантычным полем лексемы *garðr* (*-s, -ar*) 'плот, сцяна; замкнёная прастора, двор; дом, жытло; крэпасць, замак' (англ. *fence, wall; enclosed space, yard; house, dwelling; stronghold, castle*) [19, с. 161]. Таму ўзнікае пытанне аб карэктнасці атаяснення ўжытага ў "*Völuspá*" выразу "<...> *borgar ása* <...>" ('крэпасць Асаў') з гіпатэтычным кантэкстуальным сінонімам "*garðrar ása*" ('крэпасць Асаў'), альбо *Ásgarðr* ('Асгард'). Магчыма, падобная сувязь і існуе, але наўрад ці яна з'яўляецца важкай падставай для нейкіх высноў еўгемерычнага кшталту аб рэальным зруйнаванні нейкага вайскова-палітычнага цэнтра сіндаў / Асаў у час іх гіпатэтычнага канфлікту з "яванамі". "*Völuspá*" — складаны вершаваны твор са спецыфічнай апакаліптычнай прагматыкай, сэнсаўтварэнне ў якім функцыянуе па сваіх адметных законах, і ў гэтых стасунках "*Ynglinga saga*" Сноры Стурлусана, адмыслова створаная ў якасці гістарычнай крыніцы, з'яўляецца больш важкім сведчаннем. Сноры Стурлусан, у сваю чаргу, ніяк не згадвае пра разбурэнне Асгарда ў час вайны, заўважаючы толькі, што варагуючыя бакі "<...> *змагаліся і наносілі адзін аднаму шкоду*" ("<...> *herjuðu hvárir land annarra ok gerðu skaða*") [2, с. 5].

Асгард наўрад ці мог быць зруйнаваны ў час вайны паміж Ванамі і Асамі, бо ў той перыяд ніякіх сіндскіх паселішчаў на Таманскім паўвостраве не існавала ўвогуле [72, с. 118–119]. Яго, хутчэй за ўсё, можна атаясніць з горадам Лабрыс (Сямібратняе гарадзішча) — неаспрэчнай сталіцай сіндскай дзяржавы [70, с. 226] — заснаваным не раней за самы пачатак V ст. да н. э. [73, с. 153] на ўсходнім беразе Танаквісла / Баспора Сіндскага, на той час судаходнага [70, с. 257–258]. Менавіта гэты горад зрабіўся "<...> *адзінай кропкай прыцягнення*

[1] <Одзін кінуў // у войска капʼё, // было гэта ў вайну // першую ў свеце; // абрынуліся муры // крэпасці Асаў, // Ваны ў бітве // ворагаў перамагалі>.

*сіндскай знаці, асабліва на раннім этапе*” [70, с. 237], відавочнай адзнакай чаго сталі пахавальныя курганы сіндскіх цароў і арыстакратаў, вядомыя як Сямібратнія курганы, з раскошным інвентаром; і гэта сярод іншага абумовіла “<…> *у далейшым асобую ролю Лабрыса як у фарміраванні ў Сіндыцы элементаў дзяржаўнасці ранняга тыпу, так і ў падзеях вайскова-палітычнага характару*” [72, с. 124].

Так, Лабрыс сапраўды стаў сакральным цэнтрам для сіндскіх эліт, і ў гэтай якасці ён у многім адпавядае той ролі, якую адыгрываў Асгард у нардычным сакруме. Сама назва горада рэканструявана на падставе выпадковай знаходкі на Сямібратнім гарадзішчы каменнага пастамента з вершаваным прысвячэннем ад імя баспорскага цара Ляўкона I, у якім згадваецца “<…> *уладар гэтага горада лабрыцян* <…>” (“<…> *τῆσδε πόλεως μεδέοντι Λαβρυτῶμ* <…>”) [74, с. 145]. Тым не менш нічога не перашкаджае дапусціць, што ў нардычнай традыцыі замест намінальнай назвы горада выкарыстоўваўся рытуальны перыфраз альбо паэтычны кенінг, дзе “крэпасць Асаў” / Асгард — Лабрыс.

***

У такіх варунках асаблівую цікавасць уяўляе яшчэ адна супольнасць, лакалізаваная некалькі пазней на азіяцкім беразе Баспора. Яе згадвае Страбон, калі пералічвае насельнікаў гэтага рэгіёна (*Strabo* XI. II. 11): “*τῶν Μαιωτῶν δ’ εἰσὶν αὐτοί τε οἱ Σινδοὶ καὶ Δανδάριοι καὶ Τορέται καὶ Ἄγροι καὶ Ἀρρηχοί, ἔτι δὲ Τάρπητες Ὀβιδιακηνοὶ Σιττακηνοὶ Δόσκοι, ἄλλοι πλείους: τούτων δ’ εἰσὶ καὶ οἱ Ἀσπουργιανοὶ μεταξὺ Φαναγορείας οἰκοῦντες καὶ Γοργιπίας ἐν πεντακοσίοις σταδίοις* <…>”[1] [58, с. 695]. У гэтым спісе плямёнаў Географ адначасова згадвае і сіндаў (*Σινδοὶ*), і аспургіянаў (*Ἀσπουργιανοὶ*), хоць арэал апошніх “<…> *існуе прыкладна ў тых жа межах, што і Сіндыка: паміж Фанагорыяй і Гаргіпіяй* <…>” [72, с. 119]. Далей Страбон досыць няўцямна ўдакладняе (*Strabo* XII. III. 29): “<…> *Ἀσπουργιανοῖς καλουμένοις τῶν περὶ τὴν Σινδικὴν βαρβάρων* <…>”[2] [58, с. 780]. Натуральна, што такое супадзенне арэалаў, а таксама ўжыванне выразу “*так званыя аспургіяны*” (*Ἀσπουργιανοῖς καλουμένοις*) спарадзілі шэраг версій адносна прыроды гэтага соцыуму. Так, “*іх лічаць альбо племенем меота-сармацкага ці іншага паходжання* <…>, *альбо вайсковай дружынай* <…>, *альбо групай ці партыяй палітычных прыхільнікаў Аспурга, імя якога лягло ў аснову назвы* <…>” [75, с. 65].

У археалагічным вымярэнні арэал “*аспургіянаў*” — цяжкаўзброеных вершнікаў з мячамі і коп’ямі — перш за ўсё маркіруецца чалавечымі пахаваннямі з конямі, а таксама асобнымі конскімі пахаваннямі, прычым

---

[1] <Да ліку меотаў належаць самі сінды, дандарыі, тарэаты, агры, арэхі, а таксама тарпеты, абідыякены, сітакены, доскі і некаторыя іншыя: да іх ліку належаць аспургіяны, што жывуць на прасторы ў 500 стадый паміж Фанагорыяй і Гаргіпіяй <…>>.

[2] <<…> так званыя Аспургіане – варвары, што жывуць каля Сіндыкі <…>>.

палеанталагічныя даследаванні касцявых парэшткаў пахаваных людзей "<...> *выявілі яўныя індыкатары механічнага стрэсу, звязаныя з верхавой яздой*" [76, с. 273]. Акрамя таго, сярод пахаваных такім чынам "*аспургіянаў*" прысутнічаюць не толькі парэшткі мужчын, але таксама і парэшткі жанчын, і нават дзяцей, і з гэтага вынікае, што "<...> *сумесна з коньмі ў некропалі* <...> *хавалі не прадстаўнікоў якогасьці саслоўя, напрыклад, конных воінаў-дружыннікаў* <...>*, але членаў пэўнай этнасацыяльнай групы (племені, сегмента племені?), што ўключала ў сябе, акрамя мужчын, таксама і жанчын і дзяцей*" [76, с. 278]. У такіх варунках конь з'яўляўся агульнаплемянным татэмам "*аспургіянаў*", які выконваў функцыі як агульнага першапродка "людзей-коней", так і медыятара паміж светам жывых і светам памерлых.

"*Аспургіяны*" былі ўзброены на сармацкі манер, што стала адной з прычын іх іранскай атрыбуцыі. Разам з тым пахавальны абрад, звязаны з гэтымі вершнікамі, быў яўна не сармацкі, бо "<...> *уласна сарматам звычай падобных конскіх пахаванняў быў чужасны*" [76, с. 273], і, акрамя таго, на вызначаным Страбонам арэале рассялення "*аспургіянаў*" (каля 88 км узбярэжжа) не выяўлена "<...> *пакуль ніводнага сармацкага паводле абраду могільніка*" [77, с. 81]. Увогуле, як ужо адзначалася, Страбон размяшчаў "*аспургіянаў*" непасрэдна на племяннной тэрыторыі сіндаў, якую тыя засялялі па меншай меры ў VI–II стст. да н. э. Таму у гэтых варунках, як даводзіць Аляксандр Масленнікаў, магчымыя два варыянты: альбо "*аспургіяны*" / сарматы часткова выцеснілі сіндаў (часткова асіміляваліся з імі), альбо яны былі часткай уласна сіндаў. Прытым "*першае меркаванне агульнапрызнанае, а другое — нікім не разглядалася. Між тым доказаў таго, што аспургіяны — сарматы, за выключэннем іранамоўнасці саманазвы, няма*" [77, с. 81].

Сапраўды, сацыёнім "*аспургіяны*" (*Ἀσπουργιανοὶ*) выводзіцца звычайна з іранскай моўнай стыхіі, дзе ён лічыцца плёнам "<...> *іранскага «aspa» — «конь» і вытворнага ад яго «aspabara» — «коннік, вершнік» (старажытнаперсідскае asabari, пехлеві asobar, навапярсідскае aswar, suwar, сірыйскае aspūrakā)* <...>", да якога далучаецца іранскі суфікс *-γ, -υγ, -ουγ, -ουκ, -ακ, -ικ, -ιγ, -ουχ* [75, с. 67]. Між тым падобная этымалогія не з'яўляецца адзінамагчымай і, як падаецца, не з'яўляецца самай верагоднай. У гэтых дачыненнях больш прымальнымі бачацца індаарыйскія моўныя паралелі, звязаныя з лексемай *pura* 'крэпасць, замак, умацаваны горад; горад, месца, дзе вялікія будынкі ахілены рвом' (англ. *fortress, castle, fortified town; a town, city, a place containing large buildings surrounded by a ditch*) [45, с. 583]. Трэба адразу адзначыць, што элемент *pura* вельмі прадуктыўна выкарыстоўваўся, напрыклад, у санскрыце для ўтварэння align рознага роду астыёнімаў: *Āśā-pura, Vana-pura* — назвы рэальных гарадоў [45, с. 133, 174]; *Gandharva-pura* — фантастычны горад на нябёсах [45, с. 282]; *Amara-pura* — жыллё несмяротных, рай [45, с. 38]. Дэрыватам ад лексемы *pura* 'горад', у сваю чаргу, з'яўляецца

лексема puraukas ‘насельнік горада’ (англ. *inhabitant of a town*) [45, с. 584]. Гэта дае падставы дапусціць, што сацыёнім “*аспургіяны*” (*Ἀσπουργιανοὶ*) з’яўляецца элінізаваным варыянтам пэўнага пракрыцкага дэматыкона, роднаснага санскрыцкаму *As-puraukas* ‘насельнік крэпасці / горада Асаў’ = ‘насельнік Асгарда, асгардзец’.

У семантычнае поле лексемы *puraukas*, акрамя таго, ўваходзіць таксама адмысловы элемент ‘насельнік Трыпуры’ (англ. *inhabitant of Tri-pura*) [45, с. 584], дзе Трыпура — нябесны трайны горад, зроблены з жалеза, срэбра і золата і населены асурамі. Насельнікі горада, асуры, — група багоў у індуізме, этымалогія назвы якіх звязана з праявамі вітальнай сілы [45, с. 106] і дамінавання, што распаўсюджваецца таксама і на міфонім Асы [78, с. 4]. Таму ў выніку *Ἀσπουργιανοὶ* = *Aspuraukas* = ‘насельнікі горада людзей, надзеленых жыццёвай сілай / уладай = ‘насельнікі Асгарда’.

Так, аспургіяны, хутчэй за ўсё, сапраўды належалі да пэўнай этнасацыяльнай групы сіндскага генезісу, якая, магчыма, мела нейкае падабенства з адносна ізаляванай вайсковай кастай і лакалізавалася першапачаткова ў Лабрысе / Асгардзе як адзінай умацаванай кропцы ў Сіндыцы[1]. Храналагічная мяжа пачатку дзеяння “*аспургіянаў*” тычыцца канца I ст. да н. э., бо непасрэдна звязваецца з гібеллю Палямона I у 8 г. да н. э. (*Strabo* XI. II. 11). Гэтая дата, у сваю чаргу, вельмі добра карэлюе з дэградацыяй Баспора Сіндскага альбо Танаквісла, бо Лабрыс, што знаходзіўся на яго ўзбярэжжы, “<...> *заставаўся даступным для звязанага з пратокай судаходства як мінімум да мяжы н. э. ці да некалькі больш ранняга часу*” [72, с. 125]. Заняпад судаходства непазбежна абумовіў знікненне мытных плацяжоў і іншых транзітных выгод і таму не мог не прывесці і да заняпаду самога Лабрыса, бо “*у канцы I ст. да н. э.* <...> *горад ужо ляжаў у развалінах*” [73, с. 151]. Палітычная актывізацыя “*аспургіянаў*” менавіта ў гэты перыяд абумоўлена, відавочна, стратай імі ў выніку прычын аб’ектыўнага кшталту звыклага месца ў сістэме гаспадарчых стасункаў Сіндыкі.

Роля аспургіянаў у баспорскім палітычным тэатры канца I ст. да н. э. не вызначаецца істотнай акрэсленасцю, але асноўным кантэкстам гэтай эпохі з’яўляўся, канешне, рымскі экспансіянізм, што выступаў галоўным фактарам мясцовай нестабільнасці. Адзіны палітычны акт, неаспрэчна прыналежны “*аспургіянам*”, заключаецца ў забойстве імі баспорскага цара Палямона I. Савецкая гістарыяграфія лічыла гэтага манарха “<...> *чалавекам абсалютна чужасным мясцовым палітычным традыцыям* <...>”, які “<...> *не мог мець аніякіх падстаў дабівацца захавання аўтаноміі Баспора альбо думаць пра нейкія гарантыі яго незалежнасці ад Рыма. На Баспоры ён выступае, такім чынам, у ролі агента рымскага ўрада. Таму энергічны супраціў, аказаны*

[1] З пачатку V ст. да н. э. у Лабрысе існавала фартыфікацыйная сітэма, раўнацэнным аналагам якой з’яўляліся толькі абарончыя збудаванні сталічнага Пантыкапея [72, с. 117–118].

*Палямону* <…> *«баспорцамі», трэба расцэньваць як выступленне, скіраванае супраць умяшання рымлян ва ўнутранае жыццё Баспора, што выбухнула пад сцягам мясцовай незалежнасці*" [79, с. 66]. Аспургіяны ў такім ракурсе паўстаюць як гарачыя прыхільнікі баспорскай патрыятычнай партыі, што свядома і актыўна змагаюцца з рымскай экспансіяй, і падобнае бачанне праблемы — трэба адзначыць — досыць добра стасуецца з легендарнай храналогіяй наратыву Сноры Стурлусана. Так, ісландскі міфограф прама адзначае, што міграцыя Асаў была непасрэдным следствам рымскага наступу, якому яны не здолелі супрацьстаяць: "*Í þann tíma fóru Rúmverja-hǫfðingjar víða um heiminn ok brutu undir sik allar þjóðir, en margir hǫfðingjar flýðu fyrir þeim ófriði af sínum eignum; en fyrir því, at Óðinn var forspár ok fjǫlkunnigr, þá vissi hann, at hans afkvæmi mundi um norðrhálfu heimsins byggva. Þá setti hann bræðr sína, Vé ok Víli, yfir Ásgarð, en hann fór ok díar allir með honum ok mikit mannfólk annat*"[1] [2, с. 6].

Як бы там ні было, але забойства аспургіянамі Палямона I, узурпатара пасаду баспорскага цара Асандра, дало магчымасць атрымаць царскую годнасць Аспургу, што прыходзіўся Асандру сынам. Самі імёны Асандра і Аспурга сведчаць пра непарыўную сувязь гэтых манархаў з аспургіянамі, таму натуральна, што на першы план у канфлікце гэтай этнасацыяльнай групы з Палямонам I вылучалася зусім не нейкая абстрактная канфрантацыя з Рымам, а жорсткая ўнутрыпалітычная барацьба розных мясцовых кланаў за дамінаванне на Баспоры. Таму няма нічога дзіўнага, што Аспург, стаўшы баспорскім царом, пачынае афіцыйна называць сябе "*Βασιλεὺ Ἀσποῦργος, φιλορώμαιος* <…>" ("*Цар Аспург, сябар рымлянаў* <…>" [80, с. 268]. Такое лавіраванне, трэба падкрэсліць, непазбежнае ў тых умовах, працягвалася досыць доўга і нават прынесла пэўны плён, бо Баспорская эканоміка ў часы цара Аспурга вызначалася інтэнсіўным ростам. Адначасова з гэтым на працягу I–II ст. н. э. працягваюць фіксавацца і спецыфічныя пахавальныя помнікі аспургіянаў [76, с. 278], што сведчыць пра захаванне гэтай супольнасці як этнасацыяльнай рэаліі на азіяцкім беразе Баспора. Урэшце, яны, магчыма, асіміляваліся, магчыма, мігрыравалалі на поўнач, але міграцыя групы пад правадырствам Одзіна адбылася, верагодна, значна раней, што вынікае з лакалізацыі ў прасторава-часавым кантынууме нардычнага міфа такіх падзей і локусаў, як смерць Бальдра, Вальхала, Рагнарок.

***

Такім чынам, ёсць падставы сцвярджаць, што еўгемерычныя падыходы да інтэрпрэтацыі скандынаўскага міфалагічнага сюжэта пра паходжанне Асаў на

[1] <У той час рымскія правадыры ішлі па ўсім свеце, зніштаючы ўсе народы, і многія ўладары ўцякалі ад іх наступу; але Одзін быў вешчуном і чарадзеем і таму ведаў, што яго насенне ўзрасце ў паўночнай частцы свету. Ён паставіў сваіх братоў, Ве і Вілі, на Асгард, а сам пайшоў прэч, і ўсе дыі з ім, і шмат іншага народу>.

чале з Одзінам з Азіі дэманструюць пэўную прадуктыўнасць. Гэты сюжэт, прыведзены Сноры Стурлусанам, складаецца з дзвюх частак. Паводле першай з іх, адлюстраванай у пралогу да "*Snorra-Edda*", прарадзімай нардычных Асаў з'яўляюцца спачатку Троя, а потым Фракія, адкуль Одзін урэшце прыводзіць сваіх паслядоўнікаў да вусця Танаіса. Другая частка наратыва адлюстравана, уласна, у "*Ynglinga saga*". Паводле яе зместу, Асы пасяляюцца ля вусця ракі Танаіс, што ўпадае ў Чорнае мора, прычым, яны жывуць у Азіі на ўсход ад Танаіса, дзе і знаходзіцца Асгард, а землі ў Еўропе на захад ад яго насяляюцца Ванамі, з якімі Асы спачатку ваююць, а потым падтрымліваюць партнёрскія стасункі, пакуль разам з Одзінам не сыходзяць на поўнач Еўропы, ратуючыся ад рымскай экспансіі.

Ранейшыя прыклады еўгемерычнай інтэрпрэтацыі генеалагічнага наратыва нардычных Асаў грунтаваліся звычайна на спробах лакалізацыі Асгарда ў раёне сучаснай дэльты ракі Дон пры яе ўпадзенні ў Азоўскае мора, што не давала пераканальных вынікаў. Так, два рэчышчы Дона — Мёртвы Данец і Стары Дон — з паселішчамі Тана і Азоў мусілі добра стасавацца з легендарнай экспазіцыяй Сноры Стурлусана, паводле якой Ваны і Асы жылі ў дэльце старажытнага Танаіса, падзеленага на два асноўныя рэчышчы — Ванаквісл і Танаквісл. Між тым галоўная праблема заключалася ў тым, што рачное вусце, апісанае скандынаўскім міфографам, звязвала Танаіс не з Азоўскім морам, як зараз, а з Чорным, і мусіла мець да таго ж мерыдыянальную арыентацыю.

Аналіз антычных пісьмовых крыніц дае падставы меркаваць, што старажытная Меатыда займала значна меншую плошчу за сучасную акваторыю Азоўскага мора, таму з Понтам Эўксінскім яна злучалася не непасрэдна ў раёне Баспора Кімерыйскага, а праз досыць доўгае рачное рэчышча, якое сучаснікі лічылі працягам рэчышча Танаіса. Пры гэтым вусце таго даўняга Танаіса складала адзінае цэлае з Баспорам Кімерыйскім, вядомым зараз як Керчанская пратока.

Даныя сучасных даследаванняў выкапнёвай фаўны пацвярджаюць гэта і сведчаць, што ў перыяд ранняй Антычнасці рэальнае вусце Танаіса / Дона разам з вусцем Гіпаніса / Кубані ўтваралі тагачасны Баспор Кімерыйскі — пратоку, арыентаваную з поўначы на поўдзень, якая ў адпаведнасці з геаграфічнымі ўяўленнямі Антычнасці падзяляла між сабой Еўропу і Азію. Палеа-Таманскі архіпелаг быў утвораны адной вялікай і дзвюма малымі выспамі, якія на ўсходзе аддзяляліся ад азіяцкай часткі мацерыка пратокай з марской вадой (Баспор Кубанскі альбо Баспор Сіндскі), што існавала з эпохі Бронзавага веку да перыяду позняй Антычнасці, пакуль урэшце не была занесена глеем. Тым самым Баспор Кімерыйскі, з'яўляючыся адначасова вусцем Танаіса, меў два асобныя, арыентаваныя з поўначы на поўдзень,

рэчышчы, якія лёгка атаясняюцца з заходнім Ванаквіслам (уласна Баспор Кімерыйскі) і ўсходнім Танаквіслам (Баспор Кубанскі альбо Баспор Сіндскі).

Заходні бераг Баспора Кімерыйскага (Ванаквісла) быў утвораны Керчанскім паўвостравам, які з сярэдзіны I тыс. да н. э. быў каланізаваны іанійскімі грэкамі, і гэта дае падставы меркаваць, што менавіта яны былі вядомы нардычнай традыцыі як Ваны. Такая форма міфоніма стала, верагодна, вынікам скандынаўскага скажэння экзаэтноніма “явана” (*yavana*) ‘іаніец’, які меў, відавочна, індаарыйскі генез, што азначае досыць шчыльны кантакт баспорскіх іанійцаў з пэўнай рэліктавай групай індаарыяў. Гэтыя індаарыі размаўлялі на нейкім прыпантыйскім пракрыце, падобным, магчыма, на мітанійскую арыйскую мову, і іх, відавочна, можна атаясніць з меотамі.

Усходні бераг Баспора Кубанскага (Танаквісла), у сваю чаргу, насялялі не меоты, а сінды. Этнагенез гэтай групы відавочна з’яўляецца вынікам узаемадзеяння ў самым канцы VII ст. да н. э. індаарыйскага меотскага субстрату са “скіфоідным” суперстратам, які быў прадстаўлены ваяўнічымі качавымі вершнікамі няпэўнага паходжання, што ў свой час самі зведалі досыць моцны іранскі культурны ўплыў. Пад “скіфоіднасцю” пры гэтым разумеецца набор досыць універсальных для VII ст. да н. э. матэрыяльных маркераў, звязаных перш за ўсё з канструктыўнымі асаблівасцямі ўзбраення і паходнага рыштунку стэпавай мілітарыі.

Сінды, аснову эканомікі якіх складала адгонная жывёлагадоўля, доўга захоўвалі родаплемянныя рысы і мелі, верагодна, у якасці сталіцы адзіны ўмацаваны горад на тэрыторыі Сіндыкі — Лабрыс, заснаваны ў пачатку V ст. да н. э., які, хутчэй за ўсё, можна атаясніць з легендарным Асгардам. Дзесьці к канцу I ст. да н. э., калі Лабрыс / Асгард прыйшоў у заняпад з-за дэградацыі навігацыйнага патэнцыялу Баспора Кубанскага / Танаквісла, з кола сіндаў вылучылася асобная этнасацыяльная група, вядомая як аспургіяны, што ўяўлялі сабой вершнікаў, узброеных на сармацкі манер, з адметным пахавальным абрадам, які, у сваю чаргу, сарматам уласцівы не быў. Іх сацыёнім *Ἀσπουργιανοὶ* з’яўляецца элінізаваным варыянтам пэўнага пракрыцкага сацыёніма, роднаснага санскрыцкаму *As-puraukas* ‘насельнік крэпасці / горада Асаў’ = ‘насельнік Асгарда, асгардзец’.

З берагоў Баспора Кімерыйскага гэтая група знікае дзесьці ў II ст. н. э., што можа сведчыць як пра яе магчымую міграцыю, так і пра асіміляцыю іншымі мясцовымі плямёнамі. Тым не менш паўночная міграцыя, звязаная з Одзінам, адбылася, хутчэй за ўсё, значна раней, і ўдакладніць яе прыкладны час павінны далейшыя даследаванні, звязаныя з лакалізацыяй такіх падзей і локусаў, як смерць Бальдра, Вальхала, Рагнарок. Акрамя таго, патрабуе далейшага аналізу “траянская” частка генеалагічнага падання нардычных Асаў, і ў тым ліку роля фракійскага дыскурсу ў этнагенезе гэтай супольнасці, асабліва

паказальная ў кантэксце фракійскага анамастыкону баспорскіх цароў, які дагэтуль не атрымаў належнага вытлумачэння.

**Спіс асноўных крыніц**

1. Edda Snorra Sturlusonar / S. Sturluson. – København : Guldendalske Boghandel–Nordisk Forlag, 1931. – 346 p.

2. Sturluson, S. Heimskringla / S. Sturluson. – København : G.E.C. Gads Forlag, 1911. – 676 p.

3. Heusler, A. Die gelehrte Urgeschichte im altisländischen Schrifttum / A. Heusler. – Berlin : Königlichen Akademie der Wissenschaften, 1908. – 102 p.

4. Ninck, M. Wodan und germanischer Schicksalsglaube / M. Ninck. – Jena : Diederichs, 1939. – 578 p.

5. Hauer, J. W. Urkunden und Gestalten der Germanisch-Deutschen Glaubensgeschichte / J. W. Hauer. – Stuttgart : W. Kohlhammer Verlag, 1940. – 1 Band, Erste bis Neunte Lieferung, komplett. – 384 p.

6. Dumézil, G. Gods of the Ancient Nortmhimen / G. Dumézil. – Berkeley ; Los Angeles; London : University of California Press, 1973. – 157 p.

7. Lindow, J. Norse Mythology: A Guide to the Gods, Heroes, Rituals, and Beliefs / J. Lindow. – Oxford ; New York : Oxford University Press, 2001. – 365 p.

8. Salin, B. Die altgermanische Thierornamentik. Typologische Studie über Germanische Metallgegenstände aus dem IV. bis IX. Jahrhundert, nebst Einer Studie über Irische Ornamentik / B. Salin. – Stockholm : K. L. Beckmans Buohdruckerel, 1904. – 418 p.

9. Щербаков, В. И. Где жили герои эддических мифов? / В. И. Щербаков. – М. : Знание, 1989. – 48 с.

10. Heyerdahl, T. Jakten på Odin: på sporet av vår fortid / T. Heyerdahl, P. Lillieström. – Oslo : J. M. Stenersens Forlag, 2001. – 319 p.

11. Verhagen, B. Kam Odin-Wodan aus dem Osten? Zur Religion der germanischen Frühzeit / B. Verhagen. – Tübingen : Grabert Verlag, 1994. – 176 p.

12. Monvmenta Germaniae Historica. Scriptorvm Rervm Merovingicarvm. – Hannoverae : Impensis Bibliopolii Hahniani, 1888. – Tomvs II. – 579 p.

13. Þorgilsson, A. Íslendingabók. Landnámabók / A. Þorgilsson. – Reykjavik : Sigurður Kristjánsson, 1891. – 277 p.

14. Дьяконов, И. М. Предыстория армянского народа. История Армянского нагорья с 1500 по 500 г. до н. э. Хетты, лувийцы, протоармяне / И. М. Дьяконов. – Ереван : Изд-во АН Армянской ССР, 1968. – 264 с.

15. Гиндин, Л. А. Гомер и история Восточного Средиземноморья / Л. А. Гиндин, В. Л. Цымбурский. – М. : Издательская фирма «Восточная литература» РАН, 1996. – 328 с.

16. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка : в 4 т. / М. Фасмер. – М. : Прогресс, 1986. – Т. 1 : А–Д. – 576 с.

17. Rozwadowski, J. Studia nad nazwami wód słowiańskich / J. Rozwadowski. – Kraków : Nakładem Polskiej Akademii Umiejętności, 1948. – 344 p.

18. Adams, D. Q. Flow / D. Q. Adams // Encyclopedia of Indo-European Culture. – London ; Chicago : Fitzroy Dearborn Publishers, 1997. – P. 206–207.

19. Zoëga, G. A Concise Dictionary of Old Icelandic / G. Zoëga. – Oxford : Clarendon Press, 1967. – 551 p.

20. Cleasby, R. An Icelandic-English Dictionary / R. Cleasby, G. Vigfusson. – Oxford : Clarendon Press, 1874. – 800 p.

21. Федосеев, Н. Ф. О времени сосуществования Елизаветовского городища и Танаиса (по данным керамической эпиграфики) / Н. Ф. Федосеев // Античный мир и археология : межвуз. сб. науч. тр. / Саратов. гос. ун-т. – Саратов, 1990. – Вып. 7. – С. 154–160.

22. Dicvili liber De mensvra Orbis terrae / Dicuilus. – Berolini : In Aedibvs Friderici Nicolai, 1870. – 443 p.

23. Anonymi (Arriani, ut fertur) periplus ponti Euxini / Anonymi (Arriani, ut fertur) // Geographi Graeci minores. – Parisiis : Editoribus Firmin-Didot et Sociis, 1882. – Vol. I. – P. 402–423.

24. Arrianus. Periplus Ponti Euxini / Arrianus // Geographi Graeci minores. – Parisiis : Editoribus Firmin-Didot et Sociis, 1882. – Vol. I. – P. 370–401.

25. Evagrius. The Ecclesiastical History / Evagrius. – London : Methuen & Co., 1898. – 358 p.

26. Procopius. History of the wars. In seven volumes / Procopius. – London ; Cambridge : William Heinemann Ltd., Harvard University Press, 1962. – Vol. V. Books VII (continued) and VIII. – 464 p.

27. Лисецкий, Ф. Н. Перспективы моделирования динамики хозяйственного освоения прибрежных зон Северного Причерноморья в позднем голоцене / Ф. Н. Лисецкий, А. П. Семенюк, Д. Г. Якущенко // Регіональні проблеми України: географічний аналіз та пошук шляхів вирішення : зб. наук. пр. / Херсон. держ. ун-т. – Херсон, 2013. – С. 110–118.

28. Агбунов, М. В. Античная география Северного Причерноморья / М. В. Агбунов. – М. : Наука, 1992. – 240 с.

29. Aristotelis. Meteorologicorum. Libri IV / Aristotelis. – Lipsiae : Frid. Crist. Guil. Vogelii., 1834. – Volumen prius. – 664 p.

30. Колтухов, С. Г. Тузлинский историко-географический район Боспора Киммерийского в античную эпоху / С. Г. Колтухов // Геополитика и экогеодинамика регионов. – 2005. – Т. 1, вып. 1. – С. 87–91.

31. Вахонеев, В. В. Подводное городище Акра и изменение уровня моря в IV в. до н. э. / В. В. Вахонеев // Боспорские чтения / Крымский ун-т им. В. И. Вернадского, Центр археолог. исследований благотворительного фонда «Деметра». – Керчь, 2015. – Вып. XVI : Боспор Киммерийский и варварский мир в период античности и средневековья. Географическая среда и социум. – С. 43–47.

32. Артюхин, Ю. В. Факторы изменчивости природных условий существования греческих колоний на берегах Меотийского озера и Киммерийского Боспора в позднеантичную эпоху / Ю. В. Артюхин // Боспорские исследования. – 2016. – Вып. XXXIII. – С. 163–185.

33. Anonymi (vulgo Schymni Chii). Orbis Descriptio / Anonimi (vulgo Schymni Chii) // Geographi Graeci minores.– Parisiis : Editoribus Firmin-Didot et Sociis, 1882. – Vol. I. – P. 196–237.

34. Polybius. The Histories. In six volumes / Polybius. – London ; New York : William Heinemann ; G. P. Putnam's Sons, 1922. – Vol. II. – 538 p.

35. Горлов, Ю. В. Палеогеография Азиатского Боспора / Ю. В. Горлов // 20 лет музею М. Ю. Лермонтова в Тамани. – Тамань : Таманский музейный комплекс, 1996. – Раздел II : Тамань археологическая. – С. 60–74.

36. de Montpéreux, F. D. Voyage autour du Caucase, chez les Tcherkesses et les Abkhases, en Colchide, en Géorgie, en Arménie et en Crimée / F. D. de Montpéreux. – Paris : Librairie de Gide, 1843. – 464 p.

37. Боспор Кубанский / Д. В. Журавлев [и др.] // Боспорские чтения / Крымский ун-т им. В. И. Вернадского, Центр археолог. исследований благотворительного фонда «Деметра». – Керчь, 2015. – Вып. XII : Боспор Киммерийский и варварский мир в период античности и средневековья. Географическая среда и социум. – С. 106–114.

38. Журавлев, Д. В. Некоторые итоги работ Боспорской археологической экспедиции на Таманском полуострове (2006–2013 гг.) / Д. В. Журавлев, У. Шлотцауер // Государственный исторический музей и отечественная археология: к 100-летию отдела археологических памятников. – М. : Государственный исторический музей, 2014. – С. 150–186.

39. Новые данные о географии Таманского полуострова в античное время / Д. В. Журавлев [и др.] // Боспорские чтения / Крымский ун-т им. В. И. Вернадского, Центр археолог. исследований благотворительного фонда «Деметра». – Керчь, 2015. – Вып. XVI : Боспор Киммерийский и варварский мир в период античности и средневековья. Географическая среда и социум. – С. 107–115.

40. Суриков, И. Е. Некоторые соображения об исчезнувшем проливе Боспоре Синдском / И. Е. Суриков // Вестн. древней истории. – 2013. – № 1. – С. 167–176.

41. Суриков, И. Е. О влиянии природных факторов на историю: античные греки в Северном Причерноморье / И. Е. Суриков // История и современность. – 2016. – № 2. – С. 63–77.

42. Graham, A. J. The colonial expansion of Greece / A. J. Graham // The Cambridge ancient history. – Cambridge : Cambridge University Press, 2006. – Vol. III. Part 3. The Expansion of the Greek World, Eighth to Sixth Centuries B.C. – P. 83–162.

43. История Востока : в 6 т. / гл. редкол.: Р. Б. Рыбаков (председ.) [и др.]. – М. : Восточная литература, 1995–2008. – Т. 1 : Восток в древности, 1997. – 668 с.

44. Kent, R. G. Old Persian. Grammar. Texts. Lexicon / R. G. Kent. – New Haven : American Oriental Society, 1950. – 216 p.

45. Monier-Williams, M. A Sanskrit-English dictionary etymologically and philologically arranged with special reference to cognate Indo-Europian languages / M. Monier-Williams. – Oxford : Clarendon Press, 1899. – 1333 p.

46. Махабхарата. Книга третья. Лесная (Араньяка-парва) / пер. с санскрита, предисл. и коммент. Я. В. Василькова и С. Л. Невелевой. – М. : Главная редакция восточной литературы издательства «Наука», 1987. – 800 с.

47. Page, R. I. Norse myths / R. I. Page. – London : British Museum Publications, 1990. – 80 p.

48. Pokorny, J. Indogermanisches Etymologisches Wörterbuch / J. Pokorny. – Bern ; München : Francke Verlag, 1959. – III. Band. – 426 p.

49. Мелетинский, Е. М. Скандинавская мифология как система / Е. М. Мелетинский // Избранные статьи. Воспоминания / Е. М. Мелетинский. – М. : Рос. гос. гуманитар. ун-т, 1998. – С. 259–284.

50. Hall, A. The Meanings of Elf and Elves in Medieval England / A. Hall // Thesis submitted for the degree of Ph. D. Department of English Language. University of Glasgow. – 2004.

51. Топоров, В. Н. Мифология: Статьи для мифологических энциклопедий : в 2 т. / В. Н. Топоров. – М. : Языки славянской культуры, 2011–2014. – Т. 1 : А–О. – 2011. – 600 с.

52. Лихт, Г. Сексуальная жизнь в Древней Греции / Г. Лихт. – М. : ЗАО Центрполиграф, 2003. – 430 с.

53. Edda (Sæmundar Edda). – Paderborn : Ferdinand Schöningh, 1876. – 560 p.

54. Щеглов, А. Н. Тавры и греческие колонии в Таврике / А. Н. Щеглов // Демографическая ситуация в Причерноморье в период Великой греческой колонизации (VIII–V вв. до н. э.) : материалы II Всесоюз. симпозиума по древней истории Причерноморья, Цхалтубо, 1979. – Тбилиси, 1981. – С. 204–218.

55. Herodotus. In Four Volumes / Herodotus. – London ; New York : William Heinemann; G.P.Putnam's Sons, 1920. – Vol. I. Books I–II. – 504 p.

56. Гайдукевич, В. Ф. Боспорское царство / В. Ф. Гайдукевич. – М. ; Ленинград : Изд-во Академии наук СССР, 1949. – 624 с.

57. Репина, Е. В. Экспорт Боспора в VI – первой трети III в. до н. э. (по материалам письменных источников) / Е. В. Репина // Научные ведомости Белгородского государственного национального исследовательского университета. Сер. История. Политология. Экономика. Информатика. – 2013. – № 22 (165), вып. 28. – С. 5–10.

58. Strabonis. Geographica / Strabonis. – Lipsiae : B.G. Teubneri, 1907. – Volumen Secundum.– 449 p.

59. Scylacis Caryandensis Periplus / Skylax // Geographi Graeci minores. – Parisiis : Editoribus Firmin-Didot et Sociis, 1882. – Vol. I. – P. 15– 96.

60. Athenaei Navcratitate. Dipnosophistarvm / Athenaei Navcratitate. – Lipsiae : B. G. Tevbneri, 1890. – Vol. III. Libri XI–XV et Indices. – 810 p.

61. Восточные славяне. Антропология и этническая история / под ред. Т. И. Алексеевой. – М. : Научный мир, 2002. – 341 с.

62. Лопатинский, Л. Заметки / Л. Лопатинский // Сборник материалов для описания местностей и племен Кавказа. – Тифлис : Канцелярия Главноначальствующего гражданской частью на Кавказе, 1896. – Вып. XXI. – С. 77–78.

63. Sulimirski, T. The Scythians / T. Sulimirski, T. Taylor // The Cambridge ancient history. – Cambridge : Cambridge University Press, 2006. – Vol. III, Part 2 : The Assyrian and Babylonian Empires and other States of the Near East, from the Eighth to the Sixth Centuries B.C. – P. 547–590.

64. Трубачев, О. Н. Indoarica в Северном Причерноморье / О. Н. Трубачев. – М. : Наука, 1999. – 320 с.

65. Polyaenus. Strategematon / Polyaenus. – Lipsiae : In aedibvs B. G. Tevbneri, 1887. – 634 p.

66. Laroche, E. Noms des Hittites / E. Laroche. – Paris : C. Klincksieck, 1966. – 385 p.

67. Childe, V. G. The Aryans. A study of Indo-European origins / V. G. Childe. – Abingdon ; New York : Routledge, 2008. – 221 p.

68. Новичихин, А. М. Население Западного Закубанья в первой половине I тысячелетия до н. э. (по материалам погребальных памятников) / А. М. Новичихин. – Анапа : РИО СГУТ и КД, 2006. – 220 с.

69. Дьяконов, И. М. История Мидии. От древнейших времен до конца IV века до н. э. I книга / И. М. Дьяконов. – Баку : Нагыл Еви, 2012. – 332 с.

70. Горончаровский, В. А. Цари и аристократия Синдики V – начала IV вв. до н.э. (по письменным и археологическим источникам) / В. А. Горончаровский // Боспорские исследования. – 2017. – Вып. XXXIV. – С. 224–260.

71. Зинько, В. Позднеархаическая история европейского Боспора в свете новейших археологических исследований / В. Зинько // Проблемы истории, филологии, культуры. – 2013. – 2 (40), апрель–май–июнь. – С. 183–193.

72. Горончаровский, В. А. Синдика в период возведения Семибратних курганов / В. А. Горончаровский // Мнемон. Исследования и публикации по истории античного мира / Санкт-Петербургский государственный университет. – СПб., 2011. – Вып. 10. – С. 115–140.

73. Горончаровский, В. А. Лабрис (Семибратнее городище) и синды (по материалам полевых исследований Боспорской экспедиции ИИМК РАН в 2001–2008 гг.) / В. А. Горончаровский // Боспорские исследования. – 2009. – Вып. XXII. – С. 150–187.

74. Тохтасьев, С. Р. Боспор и Синдика в эпоху Левкона I (Обзор новых эпиграфических публикаций) / С. Р. Тохтасьев // Вестн. древней истории. – 2004. – № 3 (250). – С. 144–180.

75. Сапрыкин, С. Аспургиане / С. Сапрыкин // Советская археология. – 1985. – № 2. – С. 65–78.

76. Медведев, А. П. О погребениях с конями в античном некрополе Фанагории / А. П. Медведев // Античный мир и археология. – Саратов : Саратов. нац. исслед. гос. ун-т им. Н. Г. Чернышевского, 2015. – С. 273–288.

77. Масленников, А. А. Население Боспорского государства в первых веках н. э. / А. А. Масленников. – М. : Наука, 1990. – 230 с.

78. Watkins, C. The American Heritage Dictionary of Indo-European Roots / C. Watkins. – New York : Houghton Mifflin, 2000. – 151 p.

79. Калистов, Д. П. Политика Августа в Северном Причерноморье / Д. П. Калистов // Вестник древней истории. – 1939. – № 4. – С. 65–77.

80. Bongard-Levine, G. Les fouilles de Phanagorie: nouveaux documents archéologiques et épigraphiques du Bosphore / G. Bongard-Levine, G. Kochelenko, V. Kouznestov // Comptes rendus des séances de l'Académie des Inscriptions et Belles-Lettres. – 2006. – Vol. 150, Num. 1. – P. 255–292.

***Asgard: geographical location and ethnic attribution***

*Based on the euchemeric analysis of medieval mythological sources in the context of the paleolandscape situation at the northern Black Sea coast and the mid-millennium BC the article concludes that the reality of cross-cultural contact of two different ethno-political groups – Sindh and Ionian Greeks, known in the Norse tradition as the Æsir and the Vanir. Such contact is localized on the shores of the The Chimerian Bosporus and connected with the process of Ionian colonization of this area and the future Bosporus Kingdom uprising.*

*It is argued that the role of myth as an effective means of history understanding remains extremely undervalued until now, and the view of the euchemeric approaches productivity to the interpretation of mythological subjects traditionally is noted if not with the scientific scorn, but the condescending skepticism from the most researchers. Meanwhile, the myth, per se, in an archaic society is the obvious result of the history sacralization as one of its main functions – zealous fixation and translation of objective information about the Beginning of a tradition, embodied primarily in the genealogical narratives, whose role in militaristic society with patrilineal system of political power inheritance has the invaluable importance. Such information, definitely, has all sorts of epic aberrations caused primarily genre specificity of artistic forms of manifestation and existence of this kind of stories. Therefore, the main task for the myth scientific deciphering*

*is correct delimitation of objective historical invoices from all sorts of rhetorical figures and other emotionally-shaped structures connected with the mythopoetic way of thinking.*

**УДК 001.891:791**



***© Олександр Безручко***
***професор кафедри кіно-телемистецтва Київського національного університету культури і мистецтв, доктор мистецтвознавства, доцент (Україна)***

***© Oleksandr Bezruchko***
*Professor of the Cinema and Television Arts dept. of the Kyiv National University of Culture and Art, Doctor of Art Studies, Associate Professor (Ukraine)*
*e-mail: oleksandr_bezruchko@ukr.net*

# СПЕЦИФІКА ВИКОРИСТАННЯ АРХІВНИХ ДЖЕРЕЛ СУЧАСНИМИ КУЛЬТУРОЛОГАМИ

***У цій статті проаналізовано специфіку використання архівних джерел сучасними культурологами і мистецтвознавцями. Досліджено спільне і відмінне в архівних першоджерелах (рукописах і машинописах) та у редагованих (т. зв. літературно опрацьованих) мемуарах; розглянуто проблематику фактологічних помилок як важливого аспекту використання першоджерел; проаналізовано відмінності в архівних і друкованих спогадах діячів української культури.***

Актуальність цього дослідження зумовлена потребою розширенням та поглибленням нових методик та підходів до науково-дослідної роботи сучасними українськими дослідниками у всіх сферах і напрямках науки та мистецтва.

Незважаючи на наукові розвідки В. Горпенка [1], Т. Дерев'янко [2], І. Зубавіної [3], М. Казьмирчук [4], Т. Кохана [5], С. Марченка [6], О. Безручка [7; 8], можна констатувати, що сучасними українськими кінознавцями ще не достатньо приділяється увага методології наукових досліджень.

Радянські мистецтвознавці у своїх наукових дослідженнях користувалися здебільшого надрукованими джерелами. В значно меншому обсязі зверталися до архівних джерел, насамперед із-за складнощів із доступом до деяких архівів і фондів. Після розвалу Радянського Союзу почали відкриватися засекречені відділи і фонди, а почасти й цілі архіви. Це привело до підвищення інтересу до